16+

Літ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 49 (5206) 9 снежня 2022 г.

ISSN 0024-4686

Старое і новае — поплеч
стар. 4



Чытач — значыць сябра
стар. 7

Маляваць атласнымі стужкамі
стар. 13

Беларускае рэха ва Узбекістане

Фота Цімура Мамадамінава з сайта gazeta.uz

Помнік Якубу Коласу ў Ташкенце.

Год 2022-гі праходзіць пад знакам двух значных юбілеяў: 140-годдзяў народных песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Па ўсёй краіне гэтыя даты адзначаюцца з помпай, і доўга яшчэ не сціхне рокат урачыстасцей… Таму бачыцца сімвалічным чарговы раз згадаць асобныя старонкі з жыцця класіка нацыянальнай літаратуры альбо, як мы пісалі раней, асобы сусветнага маштабу. Так, менавіта сусветнага маштабу! У рэшце рэшт стваральная дзейнасць Якуба Коласа не абмяжоўвалася адною Беларуссю, а прыносіла плён таксама і далёка за яе межамі, рэхам разносілася па свеце.

Так, нашым чытачам павінна быць добра вядома, што адной з найважнейшых каардынат у біяграфіі Песняра з'яўляецца Ташкент, дзе пісьменнік правёў больш за два гады ў эвакуацыі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Перыяд гэты азнаменаваўся для класіка творчымі адкрыццямі і надзвычай плённымі сустрэчамі, пакінуў след на ўсёй далейшай літаратурнай творчасці. І сёння асоба беларускага класіка стала свайго роду сувязным звяном паміж пісьменніцкімі арганізацыямі дзвюх краін. Больш за тое, імя Якуба Коласа носіць адна з ташкенцкіх вуліц, на сцяне дома, дзе пражываў паэт, маецца мемарыяльная шыльда, а ў цэнтральнай частцы горада ўстаноўлены бюст.

Варта дадаць яшчэ, што актыўная грамадская і творчая дзейнасць Якуба Коласа ва Узбекістане паўплывала не толькі на самога пісьменніка, але і на культурнае жыццё гасціннай краіны. Як, спадзяёмся, і дзейнасць усіх тых соцень і тысяч беларусаў (сярод іх хапала і людзей мастацтва), для якіх Узбекістан стаў тады домам, якіх прытуліў у складаны час, якім не даў патануць у вірах ваеннага ліхалецця. Нашчадкі тых людзей навекі ў даўгу перад народам усходняй краіны. Тым сімвалічней, што дыпламатычным адносінам Беларусі і Узбекістана хутка, ужо ў наступным месяцы, спаўняецца трыццаць гадоў.

Працяг тэмы на стар. 14—15 ▸

«ЛіМ»-акцэнты

Актуальна. «Уступная кампанія ў ВНУ не павінна быць латарэяй або ўдачным збегам акалічнасцей для асобных абітурыентаў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас нарады па пытаннях удасканалення ўступнай кампаніі ў ВНУ. Ён нагадаў, што папярэдні раз размова па пытаннях адукацыі адбылася ў жніўні. Тады Адміністрацыі Прэзідэнта і Міністэрству адукацыі была пастаўлена задача дадаткова прапрацаваць выкладзеныя ў абноўленых Кодэксе аб адукацыі і Правілах прыёму падыходы да арганізацыі падагульняльнай атэстацыі за курс сярэдняй школы і правядзення ўступнай кампаніі ў ВНУ. «Мы ўзялі паўзу, каб сур'ёзна абдумаць, ці адпавядаюць нашы падыходы і ў якой меры майму ключавому патрабаванню — убачыць кожнага абітурыента, — нагадаў Прэзідэнт і удакладніў: — Тут і цяпер нам трэба сфармуляваць механізм работы сферы адукацыі на перспектыву. Пастаянныя рэфармаванні і ўдасканаленні пасля гэтага абмеркавання павінны быць спынены».

Спадчына. «Саломапляценне Беларусі: мастацтва, рамяство, уменні» ўключана ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Рашэнне аб уключэнні беларускай намінацыі было прынята на 17-й сесіі Міжурадавага камітэта па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якая прайшла ў Марока. Удзел прыняла і намеснік начальніка ўпраўлення па гісторыка-культурнай спадчыне Міністэрства культуры Беларусі Марыя Нецвятаева. Намінацыя падрыхтавана ў 2020—2021 гадах пры фінансавай і арганізацыйнай падтрымцы Мінкульта. Беларускія творы з саломкі не маюць аналагаў у свеце, з'яўляюцца адной з найбольш адметных нацыянальных форм выяўлення духоўных каштоўнасцей і мастацкіх традыцый беларусаў.

Меркаванне. Толькі той народ, які ведае і шануе сваю гісторыю, мае права на існаванне. Аб гэтым заявіў міністр культуры Анатоль Маркевіч на адкрыцці V Нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі» ў Мінску. Паводле слоў міністра, форум «Музеі Беларусі» стаў сапраўдным святам у культурным жыцці краіны. «Аснова нашага нацыянальнага гонару — культурная спадчына, глыбокія карані, якія закранаюць тысячагадовую гісторыю нашай дзяржавы. Музейныя фонды — сапраўдная гістарычная скарбніца, невычэрпная крыніца натхнення, ведаў і каштоўнасцей. Матэрыялы, якія ёсць у музейнай супольнасці, дазваляюць атрымаць справядлівую інфармацыю, супрацьстаяць спробам фальсіфікацыі гісторыі, таму мы павінны надаваць гэтаму вялікае значэнне», — адзначыў Анатоль Маркевіч.

Вернісаж. Фотавыстаўку Марыны Бацюковай «Мары Марыны. Мінск», прымеркаваную да 955-годдзя горада, прадставілі ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі, паведамляецца на афіцыйным сайце НББ. Рознафарматная экспазіцыя паказвае беларускую сталіцу ў дэталях і панарамным выглядзе. Марына Бацюкова — удзельніца і куратар шматлікіх выставак і праектаў у Беларусі і за мяжой, член Беларускага саюза мастакоў і Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў. Экспазіцыя арганізавана Нацыянальнай бібліятэкай сумесна з Беларускім саюзам мастакоў. Работа выстаўкі «Мары Марыны. Мінск» прадоўжыцца да 23 студзеня 2023 года.

Праект. XXVI Рэспубліканская выстаўка-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў «Калядная зорка» адкрыецца сёння ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. Праект з'яўляецца вынікам правядзення рэгіянальных этапаў, якія прайшлі ў кожнай абласной установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і Мінскім палацы дзяцей і моладзі. Экспазіцыю склалі больш за 500 індывідуальных і калектыўных творчых работ з усіх куткоў краіны. Узрост удзельнікаў — ад 8 да 16 гадоў. Самыя цікавыя, яркія і змястоўныя кампазіцыі будуць прадстаўлены ў Палацы Рэспублікі на навагоднім дабрачынным свяце. Работа экспазіцыі ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі працягнецца да 28 студзеня 2023 года.

Рэгіёны. Бабруйск другі раз прыме конкурс творчасці людзей з інваліднасцю «Мы шукаем таленты», піша БелТА. Выступленні плануюцца 13 снежня. Конкурс пройдзе ў Палацы мастацтваў Бабруйска і будзе складацца з двух этапаў. Першы — падача заявак, другі — непасрэднае выступленне перад членамі журы, якія будуць ацэньваць канкурсантаў па некалькіх намінацыях: сольны вакал, вакальны ансамбль, харэаграфія, мастацкае чытанне і дэкаратыўна-прыкладная творчасць. Удзельнічаць у конкурсе талентаў можна як індывідуальна, так і калектыўна. Пасля выступлення адбудзецца цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў. Арганізатарамі творчага спаборніцтва выступілі Палац мастацтваў Бабруйска сумесна з Бабруйскай гарадской арганізацыяй грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў».

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Увага музейшчыкаў

На сустрэчы старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся Карлюкевіча з дырэктарам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргеем Усікам абмеркаваны шэраг пытанняў па прапагандзе сучаснага прыгожага пісьменства.

— Музей з'яўляецца той пляцоўкай, якая гуртуе нашых калег — членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, — заўважыў старшыня грамадскага аб'яднання. — Мы ўдзячны вам, усяму калектыву за многія ініцыятывы апошняга часу. У тым ліку і фестывалі ў філіялах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры ў розных рэгіёнах краіны. Дзякуючы менавіта гэтаму мы ўшанавалі памяць нашых класікаў, а таксама супольна з Выдавецкім домам «Звязда» падрыхтавалі і выпусцілі ў свет тры выданні вядомай аповесці класіка беларускай літаратуры Кузьмы Чорнага «Насцечка». Спадзяюся, што і надалей разам будзем прапагандаваць сучасны літаратурны працэс і расказваць грамадскасці, найперш — моладзі, пра традыцыі, вялікую гісторыю беларускай літаратуры, пра тое, што зроблена папярэднікамі.

Музейшчыкі запрашаюць Саюз пісьменнікаў Беларусі да пашырэння прэзентацыйнай дзейнасці, правядзення аўтограф-сесій і іншых мерапрыемстваў і ў Мінску, і ў іншых населеных пунктах краіны. Асаблівую ўвагу — пра гэта гаварылі і А. Карлюкевіч, і С. Усік — плануецца звярнуць на літаратурна-краязнаўчую працу, на знаёмства ў Мінску з рэгіянальнымі адрасамі беларускай літаратуры. Мерапрыемствы такога характару запланаваны ўжо ў першым квартале наступнага года.

Сяргей ШЫЧКО

імпрэзы

«Белая птушка зімы»

Менавіта такую паэтычную назву мела мерапрыемства, якое адбылося 30 лістапада ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. І сапраўды, некаторыя выступоўцы на гэтай незвычайнай імпрэзе нагадвалі сваімі вопраткамі нетутэйшых птушак, якія дзіўным чынам трапілі да нас з далёкага ўсходу.

Знаёмства з культурай іншай краіны ўзбагачае ўласную — выдатна, калі гэты працэс узаемны. Так, ужо колькі гадоў спявачка і педагог Ірына Лой курыруе сумесную творчую дзейнасць студэнтаў Кітая і Беларусі, і вечар у музеі стаў для іх добрай нагодай прадэманстраваць вучням свае ўменні. У выкананні Кацярыны Дударавай і Луізы Барнатовіч прагучалі класічныя кампазіцыі Станіслава Манюшкі. Лі Сяа Хань і Луань Юй Цзэ прадставілі твочасць Лю Цына, Сюй Пэй Дуна, Луан Кая. Але асабліва ўзрушыла гледачоў выкананне кітайскімі студэнтамі песні «Летняя ночка купальная...». Акампаніравала спевакам цудоўная Кацярына Грынь.

Вельмі цікавая па мелодыцы і энергетыцы падачы атрымалася песня партовых грузчыкаў у выкананні баса-барытона Луань Юй Цзэ, якога, па меркаванні выкладчыкаў, чакае вялікая будучыня, калі ён працягне займацца музыкай і далей.

На мерапрыемстве гучала і паэзія. Перакладчыца Юлія Алейчанка прачытала свае пераклады з Лі Хэ, Сюй Чжымо, Вэнь Ідо, а таксама распавяла пра тое, як ішла работа над серыяй «Светлыя знакі: паэты Кітая». Яна згадала перакладчыкаў, кансультантаў, мастакоў, тых, хто дапамагаў рабіць гэтую важную справу і расці ад кнігі да кнігі.

Імправізаваную сцэну ўпрыгожвалі карціны Аляксея Хацкевіча «Максім Багдановіч. Зімовы вобраз» і Васіля Зянько «Начны крык крумкача». Васіль Зянько пасля звароту да творчасці Алеся Разанава, Максіма Багдановіча, Валянціна Таўлая, падрыхтаваў серыю работ па вершах Лі Бо ў спецыяльнай тэхніцы, якую можна прачытаць навобмацак і пазнаёміцца з вершамі, прадстаўленымі на палотнах дзякуючы шрыфту Брайля, на розных мовах, у тым ліку на кітайскай.

Фота Кастуся Дробава.

А завяршыў імпрэзу майстар-клас ад лаўрэатаў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў Ірыны Лой і Аляксандра Данілава. Ірына Лой некалькі гадоў прапрацавала ў Кітаі і прывезла кавалачак усходу да нас — яна на найвышэйшым прафесійным узроўні выконвае складаныя класічныя арыі на кітайскай мове. Прыемна ведаць, што дзякуючы таленавітым вучням Ірыны з Беларусі ў Кітай выправіцца таксама і наша песня.

Міхал БАРАНОЎСКІ

конкурсы

Зорны час для юнага чытача

У рамках рэалізацыі праекта «Пісьменнікі — ураджэнцы роднага краю» Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна аб'яўляе анлайн-конкурс чытальнікаў «Пад зоркай Венеры», прысвечаны папулярызацыі творчасці класіка беларускай літаратуры.

Партнёрамі праекта выступаюць Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Выдавецкі дом «Звязда» (газета «Літаратура і мастацтва»), Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, Радыёканал «Культура» і прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Літаратурны конкурс праходзіць да 20 снежня, прыняць удзел у ім могуць дзеці і падлеткі да 18 гадоў з усіх куткоў Беларусі. Для гэтага неабходна запісаць на відэа чытанне любога верша Максіма Багдановіча на беларускай ці рускай мовах, загрузіць ролік на воблачнае сховішча і адправіць спасылку на электронную пошту *concurs.bogdanovich@gmail.com* з адкрытым доступам на запампоўку.

Работы ўдзельнікаў разгледзіць журы на чале са старшынёй — дырэктарам Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача Верай Паляковай-Макей. У склад экспертнага савета ўваходзяць літаратуразнаўцы, пісьменнікі і артысты, якія будуць улічваць выразнасць чытання і артыстычнасць выканання ўдзельнікам верша Максіма Багдановіча.

Пераможцы конкурсу будуць абвешчаны на сайтах і ў сацыяльных сетках арганізатара і партнёраў.

Больш падрабязна даведацца пра анлайн-конкурс можна на сайце Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна *http://pushlib.org.by/*, у сацыяльных сетках бібліятэкі, а таксама па тэлефонах: (8 017) 394-16-84; 373-70-43.

Таццяна ЛАЎРЫК

анонсы

Касцюм як сардэчнае прыцягненне

Сёння, 9 снежня, а 17-й гадзіне ў краме «Акадэмкніга» на сталічным праспекце Незалежнасці, 72 чакаюць тых, каго цікавіць гісторыя, народная культура, этнаграфія. Тут будзе ладзіцца прэзентацыя календара мастачкі і даследчыцы Вікторыі Багдановіч «Касцюм як душа».

Каляндар пабачыў свет у выдавецтве «Тэхналогія», якое традыцыйна ўважлівае да розных праяў асветніцтва, беларускай нацыянальнай культуры, гісторыі і краязнаўства. Многія кнігі «Тэхналогіі» былі і застаюцца падзеямі ў айчынным кнігавыданні. Як і вядомыя філакартычныя альбомы серыі «У пошуках страчанага», якія прыцягнулі шырокую ўвагу краязнаўцаў, гісторыкаў, як і кнігі па беларускім краязнаўстве. Яркі прыклад апошняга часу — выдадзеная ў 2019 годзе краязнаўчая кніга «Слаўнае сяло Азярычына: Свет нашых продкаў» Змітра і Юрася Санько. А яшчэ ж часам выдаюцца і кнігі знакамітай серыі «Нашы славутыя землякі».

Словам, прыходзьце на прэзентацыю календара «Касцюм як душа» ў «Акадэмкнігу» — не пашкадуеце! Зможаце набыць каляндар, задаць пытанні выдаўцам і Вікторыі Багдановіч. Да сустрэчы!

Раман СЭРВАЧ

прэзентацыі

У кнігарню па ўражанні

У «Акадэмкнізе» прайшла прэзентацыя кніг «Кастусь і Міёна» Віктара Шніпа і «Штукарствы месяцавага зайчыка» Галіны Пшонік.

Фота Кастуся Дробава.

Падчас мерапрыемства аўтары пазнаёмілі чытачоў з новымі кнігамі. Дзецям вельмі спадабаўся расповед пра персанажаў казак. На прэзентацыі самымі галоўнымі слухачамі сталі навучэнцы 3 «А» класа гімназіі № 18 г. Мінска. Кожны маленькі чытач ўважліва слухаў і прымаў удзел у інтэрактыўных гульнях. Асабліва дзецям спадабалася адгадваць загадкі пісьменнікаў і атрымліваць за правільныя адказы салодкія прызы.

Пасля мерапрыемства каля аўтараў утварылася вялізная чарга ахвотных набыць навінку, атрымаць аўтограф і сфатаграфавацца. У кожнага прысутнага засталіся толькі самыя прыемныя ўражанні, многія сышлі з кнігай.

Анастасія КАВАЛЬЧУК

форум

Праз прызму стагоддзяў

У Кобрынскім ваенна-гістарычным музеі імя А. В. Суворава зладзілі Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Вайна 1812 года праз прызму стагоддзяў», прысвечаную 210-годдзю Кобрынскага бою, у якім была здабыта першая перамога расійскіх войскаў над арміяй Напалеона.

У малой зале Кобрынскага палаца культуры сабраліся прадстаўнікі раённай улады, навукоўцы, гісторыкі, краязнаўцы, літаратары, бібліятэкары, педагогі, супрацоўнікі музеяў, сябры ваенна-патрыятычных клубаў, прадстаўнікі духавенства, грамадскіх арганізацый, школьнікі і тыя, хто цікавіцца гісторыяй увогуле і мінулым роднага краю ў прыватнасці.

На пачатку з прывітальным словам звярнуліся ганаровыя госці, у ліку якіх — намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама Іван Каробка, старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Русское общество» (г. Брэст) Сяргей Моладаў, старшыня гісторыка-патрыятычнага аб'яднання «Багратион» (г. Масква) Рыгор Бродскі. Прагучала і прывітанне Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Барыса Грызлова.

Прыемным сюрпрызам для самых юных гасцей канферэнцыі сталі дыпломы і падарункі за ўдзел і перамогу ў конкурсе дзіцячага малюнка «Аб подзвігах, аб доблесці, аб славе», арганізаваным Кобрынскім ваенна-гістарычным музеем імя А. В. Суворава пры падтрымцы Галерэі воінскай сімволікі «Марс» (г. Масква) і Расійскага цэнтра навукі і культуры ў Брэсце.

На пленарных пасяджэннях і ў рабоце секцый (у музеі) прагучала каля сарака дакладаў. Усе яны тым ці іншым чынам тычыліся асноўных тэм канферэнцыі, закранаючы розныя бакі вядомых падзей 210-гадовай даўнасці. Канешне, нямала ўвагі ўдзялялася Кобрынскаму бою 1812 года. Тыя дакладчыкі, якія не змаглі па розных прычынах наведаць Кобрын, далучыліся да мерапрыемства анлайн.

Наталля ЕФЦІФЕЕВА

спадчына

Дастаеўскі назаўсёды

У вёсцы Дастоева Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці пры падтрымцы Рускага дома ў Брэсце адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Дастаеўскія чытанні — 2022».

Удзельнікі наведалі з экскурсіяй адзіны ў Беларусі музей Фёдара Міхайлавіча, што размясціўся ў мясцовай школе, усклалі кветкі да помніка выбітнаму земляку, пабывалі ў Троіцкай царкве.

У музеі сёння захоўваюцца ўнікальныя рэчы: першае выданне «Бедных людзей», першая біяграфія Дастаеўскага, выдадзеная да 10-годдзя з дня смерці пісьменніка, першая публікацыя рамана «Ідыёт» у часопісе «Русский вестник». Экспазіцыя пашыраецца штогод, а сёлета музей стаў лаўрэатам рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь». Сярод экспанатаў як сімвал пераемнасці пакаленняў, бесперапыннай духоўнай і творчай працы прадстаўлены кнігі сучасных пісьменнікаў-землякоў — Георгія Тамашэвіча, Анатоля Крэйдзіча, Андрэя Мазько, Мікалая Панасюка…

У канферэнцыі ўзялі ўдзел 50 даследчыкаў. Старшыня Брэсцкага аддзялення Рускага таварыства Святлана Смірнова перадала новыя матэрыялы ў фонд музея. Цікавым было выступленне намесніка дырэктара ДУА «Ліцэй № 1 імя А. С. Пушкіна» Ільі Пархуціча, якое тычылася ролі сучаснага тэатральнага мастацтва ў вывучэнні творчасці Дастаеўскага ў школе. Настаўніца СШ № 15 Галіна Дэкола падрыхтавала відэапрэзентацыю «Мой асабісты позірк на Музей Дастаеўскага ў Санкт-Пецярбургу», а настаўніца СШ № 28 Наталля Дзярнова распавяла аб узроўні знаёмства з творамі Дастаеўскага ў школах краін СНД, Еўропы і Азіі.

Удзельнікі канферэнцыі прынялі рэзалюцыю аб неабходнасці аднаўлення сядзібы роду Дастаеўскіх і выказалі надзею, што з цягам часу цудоўныя беларускія мясціны, дзе так шануюць слова, літаратурную спадчыну і ганарацца сваімі таленавітымі землякамі, прыцягнуць увагу аматараў літаратуры з усяго свету.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

праекты

Пісьменнік з Кленніка

У рамках абласнога праекта «Пісьменнікі — ураджэнцы роднага краю» Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча правяла тэматычную вечарыну «Мікола Нікановіч — пісьменнік з Кленніка», прымеркаваную да 120-годдзя з дня нараджэння пісьменніка.

Імя Міколы Нікановіча непарыўна звязана з гісторыяй пісьменнікаў-маладнякоўцаў, якія ў 30-я гады ўварваліся ў літаратуру з рэвалюцыйнай непрымірымасцю і верай у светлую будучыню.

Пасля баёў з белапалякамі і настаўніцтва, напрыканцы 20-х гадоў XX стагоддзя Мікола Нікановіч пераехаў у Мінск і пачаў супрацоўнічаць з беларускімі газетамі і часопісамі. Сябраваў з такімі пісьменнікамі, як Ц. Гартны, М. Лынькоў, В. Коваль, П. Броўка, М. Лужанін, А. Дудар і інш.

На вечарыне выступілі Віктар Жыбуль, паэт, кандыдат філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва з відэапрэзентацыяй «Дакументы Міколы Нікановіча ў фондах БДАМЛМ», Таццяна Лаўрык, магістр філалагічных навук, загадчыца аддзела бібліятэказнаўства Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна з дакладам аб жыцці і творчасці М. Нікановіча і Аксана Данільчык, паэтэса і перакладчыца.

Цудоўным дапаўненнем мерапрыемства стала выступленне Яўгеніі Дзяркач, паэткі-аматаркі, майстрыцы з в. Кляннік, унучатай пляменніцы Мікалая Нікановіча, якая распавяла пра малавядомыя факты з жыцця пісьменніка. Згадала гісторыю яго бацькоў і ўвогуле сямейных традыцый сям'і Нікановічоў.

Арганізатарамі праекта выступілі Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна, публічныя бібліятэкі Міншчыны, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Выдавецкі дом «Звязда» (газета «Літаратура і мастацтва»), Выдавецтва «Мастацкая літаратура» (часопіс «Полымя»), Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача.

Аляксандр МАРОЗАЎ,
метадыст Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М. Багдановіча

«ЛіМ»-люстэрка

Усеіспанская асацыяцыя *EsBelarus* працягвае дзейнасць па папулярызацыі беларускай культуры. Аб гэтым заявіла кіраўнік арганізацыі Святлана Яськова, якая прыняла ўдзел у пасяджэнні Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа ў Міністэрстве замежных спраў. Як удакладняюць у ведамстве, беларуская дыяспара ў Іспаніі працягвае збірацца і шанаваць прадстаўнікоў айчыннай культуры. «Сустракаліся з нагоды 140-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, праводзілі буйныя мерапрыемствы, звязаныя з юбілеямі іншых беларускіх пісьменнікаў, — расказала Святлана Яськова. — Велізарную падзяку хачу выказаць Музею гісторыі беларускай літаратуры і Літаратурнаму музею Максіма Багдановіча, якія заўсёды з намі ўзаемадзейнічаюць». Яна таксама адзначыла, што зараз рыхтуюць пераклад аповесці «Альпійская балада» Васіля Быкава на іспанскую мову.

На міжнародным фестывалі «Дні кароткаметражнага кіно» (*Short Film Days*) у Маскве прадставяць работу беларускага аўтара. Стужку «Сапраўдны спагеці-вестэрн» рэжысёра Аляксандра Александровіча пакажуць у катэгорыі «Анімацыйнае кіно». Мерапрыемства будзе праходзіць з 14 да 21 снежня. Рэха кінаагляду прадоўжыцца да 15 лютага 2023 года ў рэгіёнах Расіі, а таксама замежных краінах. Фестываль праводзіцца прадзюсарскім цэнтрам «Мувістарт» пры падтрымцы Прэзідэнцкага фонду культурных ініцыятыў і Саюза кінематаграфістаў Расіі, інфармуе БелТА. Конкурсная праграма будзе прадстаўлена ў трох катэгорыях — ігравое, дакументальнае і анімацыйнае кіно.

Акадэмічныя артысты Белдзяржфілармоніі плануюць выступіць на сцэнах Астаны і Алматы. «Мы хацелі б пашырыць свой удзел у культурным жыцці гэтай краіны, у прыватнасці Астаны і Алматы, а таксама ўбачыць найлепшых акадэмічных выканаўцаў Казахстана ў нашай краіне, у тым ліку на сваёй пляцоўцы», — цытуе БелТА словы генеральнага дырэктара Беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандра Нікіты. Гэтымі днямі Беларуская дзяржаўная філармонія і «Казахканцэрт» падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве. «Мы аналізавалі, якія праекты былі б асабліва цікавыя, — адзначыў Аляксандр Нікіта. — Нас хвалюе харавая (акадэмічная) творчасць казахстанскага боку, пачынаючы ад струннага квартэта і заканчваючы сімфанічным аркестрам. Хацелася б арганізаваць абмен дырыжорамі. Увогуле, для нас вельмі важна разнастаіць канцэртныя праграмы, уключыўшы туды выканаўцаў з Казахстана».

У Магілёве прайшоў IV Міжнародны фестываль-конкурс мастацтваў «Залатая мара», паведамляе БелТА. Месцам прыцягнення фестывалю-конкурсу стаў Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы. Юныя таленты прыехалі з розных рэгіёнаў Беларусі — Магілёўскай, Мінскай, Гомельскай, Гродзенскай, Віцебскай абласцей, а таксама з Астраханскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Усяго на конкурс было пададзена 285 заявак. Удзельнікамі сталі каля 2 тысяч чалавек — індывідуальныя выканаўцы і творчыя калектывы.

Раман Гузелі Яхінай «Эшалон на Самарканд» названы пераможцам чытацкага галасавання расійскай нацыянальнай літаратурнай прэміі «Большая книга». Як піша РІА «Новости», народнае галасаванне XVII сезона прэміі «Большая книга» праходзіла на сайце найбуйнейшага кніжнага рэкамендацыйнага сэрвісу *LiveLib*, які ўваходзіць у групу кампаній «ЛитРес». У галасаванні прынялі ўдзел звыш 5,5 тысяч чалавек з усёй Расіі. Між тым другое месца чытачы аддалі «Сапраўднай гісторыі Ганны Карэнінай» Паўла Басінскага. На трэцім месцы — раман Ганны Мацвеевай «Кожныя сто гадоў».

Студыя *Focus Features* анансавала дату кінатэатральнага пракату фільма «Горад астэроідаў» Уэса Андэрсана. Паказы стартуюць у ЗША 16 чэрвеня 2023 года. Сюжэт стужкі разгортваецца ў 1955 годзе. У аддалены горад каля пустыні з'язджаюцца дзясяткі вучняў і іх бацькоў для ўдзелу ў конкурсе астраномаў. Неўзабаве з'езд перарываюць падзеі, якім наканавана назаўжды змяніць свет. У «Горадзе астэроідаў» здымаліся Скарлет Ёхансан, Том Хэнкс, Марго Робі, Цільда Суінтан, Уілем Дэфо, Эдвард Нортан, Стыў Карэл, Эдрыян Броўдзі, Браян Крэнстан, Джэф Голдблюм і іншыя. Сцэнарый рэжысёр пісаў сумесна з Раманам Копалам. Як мяркуецца, перад пракатам фільм пакажуць на сусветнай прэм'еры ў Канах. Там жа дэманстравалі папярэдні фільм Уэса Андэрсана «Французскі веснік», удакладняецца на партале «*film.ru*».

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

«Ячмяні зашумяць пазалотай…»

Сёлета Беларусь адзначыла юбілеі геніяльных класікаў нашага прыгожага пісьменства Янкі Купалы і Якуба Коласа — 140 гадоў з дня нараджэння. Іх жыццё і літаратурная дзейнасць адлюстравалі велічныя і трагічныя падзеі станаўлення беларускай нацыі і дзяржаўнасці. Акрамя іншага, яны праявілі сябе як грамадскія дзеячы і педагогі.

Ужыццяпісе Янкі Купалы, змешчаным у поўным зборы твораў паэта, можна прачытаць, што 5 красавіка 1939 года ён «разам з Якубам Коласам, Міхасём Лыньковым і іншымі пісьменнікамі выступаў на вечары студэнтаў Мінскага пед-інстытута імя Горкага, чытаў вершы». Колькі радкоў пра адно з выступленняў, якое, між іншым, стала для кагосьці знакавай падзеяй і нават прадвызначыла лёс.



Литературный вечер

5 апреля в актовом зале Минского педагогического института им. Горького состоялся большой литературный творческий вечер студентов с участием писателей-орденоносцев.

Вступительное слово о работе молодых начинающих авторов сделал писатель-орденоносец М. Лыньков.

С чтением своих произведений выступили литкружковцы.

На вечере прочитали стихи народные поэты Якуб Колас и Янка Купала, восторженно встреченные студентами. Тов. Якуб Колас также поделился своим мнением о работе начинающих авторов, в частности отметил творчество литкружковца пединститута М. Аврамчика. Свои новые стихи прочитали на вечере Э. Огнецвет и К. Титов.

Большое внимание привлекла витрина творчества начинающих поэтов и писателей—студентов педагогического и медицинского институтов, а также Коммунистического института журналистики БССР. Здесь произведения Кондратени, П. Дудо, П. Рунца и других.

Вечер послужил укреплению творческой связи начинающих авторов с мастерами художественного слова.

Д. ПУЛЬЯНОВ.

Нататка ў газеце «Советская Белоруссия» № 80 ад 8 красавіка 1939 года.

Прапаную зладзіць невялікую рэканструкцыю гэтага мерапрыемства і паглядзець на яго вачыма журналіста, непасрэднага ўдзельніка, а таксама гледача — аднаго з навучэнцаў пединстытута, дзе ладзілася вечарына. Паспрабуем праз розную оптыку ацаніць тое, што адбывалася на сцэне і ў зале.

Спачатку звернемся да матэрыялу, які быў апублікаваны неўзабаве пасля сустрэчы — у газеце «Советская Белоруссия» № 80 ад 8 красавіка 1939 года на апошняй яе старонцы.

На жаль, аўтар нататкі быў нешматслоўны, а сухі газетны стыль няхай і перадае сутнасць падзеі, але не дае магчымасці ацаніць атмасферу, у якой усё адбывалася.

Чалавек, для якога гэтая падзея стала асабліва важнай, — дзевятнаццацігадовы студэнт Мікола Аўрамчык. Нядзіўна, што той дзень згадваецца ў яго ўспаміне — «Пра сябе».

З гэтых мемуарных запісаў мы даведваемся, што ў інстытуце ішло актыўнае літаратурнае жыццё, выдаваўся часопіс «Наша творчасць», ладзіліся вечары з беларускімі пісьменнікамі, і Міколу Аўрамчыку добра запомнілася якраз апісаная падзея, якая паслужыла сапраўдным штуршком для яго творчасці і надала веры ў свае сілы.

Згодна з успамінамі, літгурткоўцы былі запрошаны да пісьменнікаў-ардэнаносцаў і камсамольскага начальства ў прэзідыум. І там, седзячы побач з Коласам і Купалам, ён заўважае, што, пакуль нехта з выкладчыкаў інстытута расказваў аб творчасці маладых аўтараў, Якуб Колас праглядаў студэнцкі часопіс, звярнуў увагу на верш Аўрамчыка «Адлёт жураўлёў» і паказаў яго Янку Купалу. Далей дадзім слова самому літгурткоўцу: «А тут якраз яб'явілі, што чытаць свае вершы будуць пачаткоўцы, і першаму слова далі мне. Я канчаткова разгубіўся, нясмела выйшаў на трыбуну, па ўсіх кішэнях шукаў свае рукапісы і, як на злосць, не знаходзіў іх. У першых радах залы пачалі смяяцца. Нарэшце я сумеўся і, хвалюючыся, прачытаў на памяць "Адлёт жураўлёў" і яшчэ нейкі верш. Воплескі студэнтаў крыху згладзілі непрыемнае ўражанне».

Мікола Аўрамчык згадвае, што асабліва цёпла студэнты сустрэлі выступленне ардэнаносных гасцей, што Янка Купала чытаў верш «А мы сабе сеем і сеем» і ўрывак з паэмы «Тарасова доля», а Якуб Колас — вершы «18 з'езду» і «Прывітанне Маскве».

Але ў іншым сваім успаміне «З іменем Купалы — у сэрцы» гэтая цёплая сустрэча ўжо не падаецца такой цёплай: «Як бы ні быў я тады ўсхваляваны тым, што ў іх прысутнасці мне далі слова першаму, і якое расчараванне ні адчуваў бы пасля свайго разгубленага выступлення, але ўсё роўна вельмі ўважліва слухаў, як выступалі яны абодва.

Зараз Янка Купала чытаў верш "А мы сабе сеем і сеем" і ўрывак з паэмы "Тарасова доля".

Ці ад таго, што выбраў ён доўгія для чытання рэчы, ці таму, што чытаў іх нараспеў, са звонкай працяжнасцю, трохі крывячы рот, ягонае чытанне на гэты раз здалося мне аднастайна-манатонным і нуднаватым.

Пераконвала ў гэтым і тое, як расслаблена ўспрымала яго выступленне шматлюдная аўдыторыя, хаця я не сумняваўся, што пераважная большасць студэнтаў не толькі слухала, але і бачыла паэта ўпершыню».

Так згадваў выступленне Мікола Аўрамчык. Але часта бывае, што ўспрыманне непасрэднага ўдзельніка часам не супадае з тым, як гэта бачыць аўдыторыя.

Стварыць трэці ракурс нам дапаможа дзённікавы запіс Самуіла Александровіча, які на тую пару быў навучэнцам пединстытута, знаходзіўся ў зале і занатоўваў тое, што бачыў на сцэне. На жаль, не ўсе словы гэтага ўнікальнага дакумента, прадстаўленага сёлета на архіўных чытаннях у БДАМЛМ, паддаюцца расшыфроўцы, але нават тое, што ўдалося расчытаць, дазволіць нам пашырыць веды пра далёкую падзею і яе ўдзельнікаў. Прапаную вашай увазе тэкст з невялікімі скарачэннямі.

«5/IV. Чакаю вечара, прысвечанага пачынаючым і стрэчы з ордэнаноснымі пісьменнікамі.

8 гадзін блізка. Увайшлі у зал. Селі ў 4-рох: Я, <...>, Коршак, Валынец.



ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ!

ПРИГЛАСИТЕЛЬНЫЙ БИЛЕТ

Уважаемый товарищ .....

Комсомольский Комитет Минского Пединститута им. А. М. Горького приглашает Вас на литературно-творческий вечер, который состоится 5 апреля 1939 г.

Программа вечера:

1. Выступление литкружковцев и начинающих писателей Пединстита.
2. Выступление писателей-орденоносцев.
3. Художественная часть.

Вечер начнется ровно в 8 часов вечера в актовой зале Главного корпуса Университетского городка.

Комсомольский Комитет МПИ им. А. М. Горького.

Запрашальнік на літаратурны вечар.

Адкрываецца вечар. У прэзідыум запрашаюцца: Купала, Колас, Лынькоў, Кучар, Цітоў, Кандраценя, Грамовіч, Аўрамчык, Сасноўскі, Коршак, Коган, Шарахоўскі, Дворкіна, Гейне, Дрозд, Рунец, Авіва Левіна, Рубенштэйн, Кручок <...>.

Першае слова даецца Лынькову. Гэта грузны з выгляду дзедушка, з падбародкам, з жыватом навесістым, тоўсты, зусім не падобен на <...> худы твар у мінулым, зусім пастараўшы чалавек, сіваватыя валасы, карычневы суконны касцюм, пінжак расхлябаны, вышываная рубашка, <...>, на грудзях шыкаваты ордэн Леніна.

Гаворыць аб культуры, становішчы за мяжой, упамінае аб <...> літаратуры і іхным лёсе у враж. краіне, у прыватнасці ў Германіі (Гейне, Шыллера…), аб фаш. гора-тэарэтыках і

ДЛЯ ЗАМЕТОК

Літаратурны дзённік Самуіла Александровіча.

іх расавай ідэйнасці арыйцаў, аб бел. літ шчасці <...> у сов. краіне, аб задачах бел. пісьменніку.

Праходзіць Агняцвет у прэзідыум.

За сталом сядзяць народныя барды Беларусі Купала і Колас. Збоку пры іх прымасціўся Кучар, штось балакае з Янкам, к ім прымнуў з-заду Кандраценя.

Лынькоў скончыў. Бура апладысментаў. Гаворыць Шарахоўскі аб літ. сілах МПІ. Успамінае Аўрамчыка, Кандраценю, Грамовіча, інш.

Пасля яго урывак з аповеду чытае Кандраценя, затым Грамовіч з "Чужога грунта".

Зала заціхае. Ля мікрафона Мікола Аўрамчык.

Нясецца сумная песня-элегія аб адлятаючых жураўлях.

Усе затоена, захапіўшыся слух <...>.

Кучар так утаропіўся і з усякай радасці, замілавана слухаў Лынькоў, Купала і Колас. Хвалявaліся, не верылі вушам, што ідзе змена старым.

Гром апладысментаў. <...> Мікола вярнуўся і прачытаў "Беларусь".

Выступіў <...>, Авіва Левіна два разы <...>, Кручок вітаў усіх МПІ ад імя Мін. Рубенштэйн прачытаў цікавыя вершы. Дрозд вітаў ад імя КіЖа. Гейне чытаў... Выступала Эдзі і храбра і прыгожа.

Потым прачытаў Купала свае вершы: вельмі прыгожы з твару, ім <...> любаваліся, фацэтны <...> курылі папіросы з Лыньковым і Коласам, смяяліся, шуцілі, часта кідалі рэплікі. Цікава ён грыз губу, проста смех браў, так шапяляў.

<...> Тады выступіў на трыбуну Колас.

Перад тым як прачытаць вершы, захацеў сказаць пару слоў <...> аб "Н.[ашай] Творчасці" МПІ <...> дзе па яго думцы маюцца <...> рэчы.

Так ён гаварыў, [пра] захапіўшы яго асабіста, нас усіх, аўдыторыю слухачоў "Адлёт жураўлёў". Ён вельмі чулліва, тужліва і па бацькоўску хваліў гэты верш.

<...>

Што вясной, прылятаючы, зблудзяць
І не знойдуць знаёмых балот;
Бо на тых непраходных балотах
Дзе ніхто не мог гнёздаў чапаць
Ячмяні зашумяць пазалотай,
Прыйдуць людзі касіць сенажаць.

Ён паставіў гэты верш у рад побач з класічным вершам "Парус" Лермантава. Так удастоены чэсці Аўрамчык каб аб ім гаварыў Колас <...>.

Аўрамчык застаўся сіня лаўрэатам <...> вечара.

Затым гаварыла Дворкіна аб сілах і талентах МПІ.

Гаварылі аб праектуемым выданні зборніка вершаў з "Н.Пі Ш" МПІ

Пасля яе загаварыў <...> Кучар, успамінаючы дэкаднік у Маскве бел. літ. і мастацтва, гаварыў аб сустрэчы з маскоўскім чытачом, <...> Купалы, успамінаў аб фота ў сялянскай свiтцы, — это <...> барацьбіта за сялянскую долю <...>.

Кончыўся вечар.

У вестыбюлі: Лынькоў у вялікім пальто заліхвацкі пакурвае, Купала ў старамоднім пальто, з крыллечкай на локці, <...>, з прыёмнай дочкай, штось гаварылі <...>.

Колас (скрыўся з віду? — закрэслена) ад<...>ваўся.

Кучар бегаў каля іх <...>».

Вось такі, крыху сумбурны тэкст, запісаны спехам у рэжыме рэальнага часу.

Прыведзеныя вышэй матэрыялы паказваюць, наколькі далікатнай матэрыяй з'яўляецца гісторыя і як адрозніваюцца звесткі трох прысутных на адной і той жа вечарыне.

Мы пабачылі, што мерапрыемства было больш прадстаўнічае, чым гэта магло падацца з газетнай нататкі і ўспамінаў, — сапраўды значная падзея ў літаратурным жыцці перадваеннага Мінска. Пабачылі, што засталіся незаўважанымі аўтарам «літаратурнага дзённіка» перажыванні Міколы Аўрамчыка, а той пранёс іх праз доўгія гады і палічыў абавязковым апісаць у сваіх мемуарах. Ёсць вялікае падазрэнне, што ў параўнанні «Адлёту журавоў» і лермантаўскага «Паруса» было прыхавана колькі коласаўскай іроніі, але і маладыя літкружкоўцы плацілі класікам-ардэнаносцам адпаведна. З аднаго боку, праз успамін і дзённікавы запіс адчуваецца пietэт да пісьменнікаў старэйшага пакалення, з другога — пэўная задзірыстасць і хлапецкасць. 40-гадовы Лынькоў у вачах студэнта Александровіча ўжо «дзедушка», Янка Купала і Якуб Колас «хвалююцца», што ім на змену ідуць новыя паэты, ды і чыталі яны свае творы так, што аўдыторыю «смех браў». Тое, што ў Янкі Купалы былі праблемы з зубамі, іх хвалявала мала. Старое і новае — вечнае і ў жыцці, і ў літаратуры.

Зусім хутка вайна пераверне жыццё ўдзельнікаў таго далёкага вечара, нехта загіне на фронце, як Самуіл Александровіч, нехта пройдзе ўсе ваенныя жахі і адолее ледзь не векавы, як Мікола Аўрамчык, шлях. А нам застанецца зберагаць памяць пра іх, супастаўляць розныя погляды і спрабаваць максімальна праўдзіва аднаўляць гісторыю жыцця выдатных дзеячаў нашай культуры.

Міхал БАРАНОЎСКІ

Фота з прыватнага архіва аўтара

пленум СПБ па дзіцячай літаратуры

Ген эксперыментатарства і не толькі

Напярэдадні пленума па сучаснай дзіцячай літаратуры, які мае адбыцца ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі, мы вырашылі бліжэй пазнаёміцца з выданнямі для дзяцей і падлеткаў, зазірнуць па той бок вокладкі часопіса, пагутарыць з тымі, хто яго стварае. Імпануе, што выконваючая абавязкі галоўнага рэдактара «Бярозкі» Паліна Каралева — крэатыўны малады спецыяліст, а значыць, лепш чым хто разумее патрэбы сённяшніх юных чытачоў, бо сама яшчэ нядаўна спазнавала свет і сябе ў ім праз прызму падлеткавага светаадчування. Сёння Паліна распавядае, як ствараецца часопіс і чым пры гэтым кіруецца рэдакцыя.

— «Бярозка» — часопіс для падлеткаў. Гэта самая ўражлівая аўдыторыя, улічваючы асаблівасці ўзросту. Якім бачыце вашага чытача?

— Добрае пытанне, бо любое выданне павінна мець свайго адрасата. Калі ён ёсць, то ёсць і мэты, і асаблівае стаўленне. Рэдакцыя «Бярозкі» разумее, што нясе адказнасць за тое, які прадукт штомесячна будзе атрымліваць чытач. Таму кожны новы нумар часопіса не павінен быць горшы за папярэдні. Размова не толькі пра змест і візуальны складнік, але і пра адносіны з чытачом.

Для нас важна, каб «Бярозка» была не безаблічнай альбо бяздушнай. Таму на першых старонках, у рубрыцы «Ад рэдакцыі», мы стараемся пакідаць пасланне, цікавіцца жыццём чытачоў, а таксама распавядаем пра сябе і свае ідэі. Так ствараецца нябачны дыялог.

Што тычыцца сукупнага вобраза нашага чытача, то ўяўляецца чалавек, якому цікава ўсё новае, хто гатовы акунуцца ў тэмы, якія раней падаваліся далекімі, і глядзець на паўсядзённасць з дыяметральна супрацьлеглых пунктаў гледжання. Не сакрэт, што «Бярозка» раскрывае розныя тэмы, пры гэтым захоўваючы высокі літаратурна-мастацкі ўзровень матэрыялаў. Як засведчыла практыка асабістых сустрэч, у чытача гэта не выклікае складанасцей. Наадварот, якасць публікацый прываблівае больш дарослую аўдыторыю. І мы робімся не толькі падлеткавым выданнем, але і часопісам, здольным вырасціць чытача і заставацца з ім так доўга, наколькі гэта для яго магчыма.

Падчас прэзентацыі часопіса «Бярозка».

— Што, на вашу думку, найбольш цікава падлеткам і якім чынам імкняцеся адлюстраваць тое ў часопісе?

— У часопісе мноства разнастайных рубрык, якія адпавядаюць зацікаўленням сучасных падлеткаў. Мы пішам пра камп'ютарныя гульні, аналізуем навінкі сусветнай мультыплікацыі і кінематографа. Аднак, на мой погляд, чытач гатовы набыць тое выданне, што здзівіць яго. Калі змест прадказальны і тычыцца актуальных толькі сёння рэчаў, гэта сумна. Таму нашы аўтары не цураюцца экскурсу ў гісторыю і ў некаторай ступені становяцца дакументалістамі.

Не менш важна, што мы пішам і аб прыватных гісторыях. Так, за кожным тэкстам стаіць асабісты досвед асобнага чалавека ці некалькіх людзей. Нехта шукае лакацыі, апісаныя ў сучасных беларускіх кнігах, іншыя вяртаюцца на малую радзіму і распавядаюць пра мясцовыя цікавосткі праз прызму згадак пра мінулае. «Бярозка» за тое, каб у тэксце прысутнічаў аўтар, каб ён распавядаў і натхняў чытача адчуваць тое ж самае.

Мяркую, нам пашанцавала знайсці свайго чытача, які насамрэч гатовы да эксперыментаў і нечаканасцей. Яму цікава ўсё сучаснае, ён гатовы адкрываць новае.

— Хто для падлетка пісьменнік? Ці можа ён стаць найлепшым сябрам і ці ёсць падобныя прыклады ў вашай практыцы?

— Тут варта асаблівую ўвагу аддаць рубрыцы «Гісторыя поспеху», дзе публікуюцца інтэрв'ю, героі якіх ажыццявілі свае мары, што спачатку падаваліся нерэальнымі. Падобныя матэрыялы становяцца для чытачоў матывацыяй, штуршком. Патлумачу, чаму гэта істотна.

Стартавы ўзрост нашых падпісчыкаў — 12 гадоў. Па сабе кожны памятае, што гэта складаны перыяд, калі важна, каб цябе падтрымлівалі. «Бярозка» з'яўляецца ў некаторай ступені правадніком, апорай. Мы даём праверанай парады і ў цэлым распавядаем пра тое, што ведаем і бачылі самі. Галоўнае — не быць пустаслоўным і шчыра імкнуцца дапамагчы.

Не магу сказаць, наколькі цесна чытачы кантактуюць з асобнымі аўтарамі часопіса, але некалькі падобных гісторый маем. Былі выпадкі, калі пісьменнікі пачыналі сябраваць з падпісчыкамі, а пасля ў рэдакцыю прыходзілі падзякі. Многія аўтары ўвогуле выхоўваюць новае пакаленне журналістаў, чые матэрыялы ўжо друкуюцца ў «Бярозцы».

Што тычыцца ўспамінаў майго юнацтва, то мне вельмі шкада, што не ведала пра такі часопіс. Таму многія матэрыялы дасюль дапамагаюць мне адважыцца на які-небудзь учынак, а героі тэкстаў (якія часта маладзейшыя за мяне) з'яўляюцца прыкладам смеласці. Таму, на мой погляд, «Бярозка» можа быць сябрам чытача менавіта як цэласнае выданне. Мы стараемся рабіць якасным усё: ад вокладкі да фінальных цітраў.

— Існуе распаўсюджанае меркаванне, быццам падлеткі не чытаюць. Можаце аспрэчыць?

— Пытанне з серыі супрацьстаяння бацькоў і дзяцей. Баюся, што нам заўжды будзе здавацца, быццам з малодшым пакаленнем нешта не так. Думаю, вы чулі фразу «КВЗ ужо не той». Але калі задумацца, праблема КВЗ у тым, што ён якраз і застаецца ранейшым, пакуль свет навокал і людзі змяняюцца. Вось і мы, як КВЗ, верныя сваім прынцыпам, у той час як рэальнасць імкліва бяжыць наперад, а юнае пакаленне падладжваецца пад новыя правілы, каб пачувацца ў гэтай гульні камфортна.

Зрэшты, спрачацца з тым, што чытаць кнігі для сучасных падлеткаў не модна, не буду. Але гэта не значыць, што друкаваныя крыніцы я называю пражыткам мінулага. Тут справа тычыцца памкненняў да новых ведаў. Мы яшчэ на пачатку вызначыліся, што чытач нашага часопіса — той, хто сам прагне адкрываць нязведанае. Мы ўсяго толькі тыя, хто дае магчымасць пазбавіцца ад мораку няведання. Мы — каталог цікавых гісторый і падзей, якасная размінка для мозгу. Ад чытача патрабуецца перагарнуць першую старонку — і, як гавораць, шоу пачнецца. Але для тых, хто не гатовы ўзяць выданне з паліцы, «Бярозка» не падыходзіць.

Ды ёсць і іншая праблема, акрамя падлеткавага нежадання вучыцца. Многія проста не ведаюць пра існаванне «Бярозкі». Мы зразумелі гэта, калі пачалі актыўна весці сацыяльныя сеткі: людзі былі здзіўлены, што часопіс дасюль выходзіць. Цяпер задача № 1 — рэклама. Сустракаемся з дзецьмі ў школах і бібліятэках, арганізуем відэаканферэнцыі, і аддача ёсць. Так што невялікі наклад выдання не заўжды залежыць ад якасці зместу альбо праблемнай аўдыторыі. Часта проста не хапае рэкламы.

Падводзячы вынікі, скажу, што не трэба спяшацца вінаваціць маладое пакаленне ва ўсіх грахах. Як пісаў Еўтушэнка, нецікавых людзей у свеце няма. Падлеткі гатовы чытаць па-беларуску, айчынны кантэнт. Проста яны не заўжды ведаюць, дзе знайсці варты матэрыял.

— А што вы самі любілі чытаць?

— У падлеткавым узросце ў мяне не было пастаянных зацікаўленняў. Кідала ад японскіх хоку да Лаўкрафта з яго вар'ятам-арабам і Некранаміконам, часам на размаітай паліцы з'яўляўся амаль кананічны Віктар Драгунскі. Можна сказаць, што гэта быў час пошукаў і ўсебаковага ўзбагачэння, што прыйшлося вельмі дарэчы пазней, праз гады. Начытанасць дапамагае. Хаця і дасюль у хатняй бібліятэцы хаос. Найбольш сталыя яе жыхары — Іосіф Бродскі, Алан Мур і Фёдар Дастаеўскі. Вельмі люблю і айчынных класікаў за эпічныя гісторыі і адносіны да роднай зямлі. Якуб Колас у сэрцы назаўжды. А самым любімым творам застаецца «Ладдзя Роспачы» Уладзіміра Караткевіча.

— Ці існуе ў нейкай форме супрацоўніцтва «Бярозкі» з пісьменнікамі, калі рэдактары, ведаючы бліжэй сваю чытацкую аўдыторыю, маглі б раіць літаратару пэўныя тэмы і сюжэты, якія ў падлеткаў прайшлі б на «ўра»? Пра што вы параілі б нашым творцам пісаць для падлеткавай аўдыторыі?

— Мы супрацоўнічаем з вялікай колькасцю пазаштатных аўтараў, гэта добры спосаб разнастаіць старонкі часопіса. Але з той прычыны, што нумары амаль заўжды тэматычныя і прадумваюцца да дробязей, любы тэкст, яго структура і канцэпцыя абмяркоўваюцца загадзя. Недатыкальным застаецца толькі аўтарскі стыль і асабістыя развагі / высновы пісьменніка. Супрацоўніцтва працягваецца і ў працэсе напісання матэрыялаў: аўтары гатовы да правак, уносяць свае прапановы. У гэтым плане ў нас вялікая свабода, галоўнае — каб тэкст узбагачаў чытача і быў цікавы ў першую чаргу самому журналісту.

Не менш важна, што мы пішам і аб прыватных гісторыях. Так, за кожным тэкстам стаіць асабісты досвед асобнага чалавека ці некалькіх людзей. Нехта шукае лакацыі, апісаныя ў сучасных беларускіх кнігах, іншыя вяртаюцца на малую радзіму і распавядаюць пра мясцовыя цікавосткі праз прызму згадак пра мінулае. «Бярозка» за тое, каб у тэксце прысутнічаў аўтар, каб ён распавядаў і натхняў чытача адчуваць тое ж самае.

— Ці можна зазірнуць па той бок вокладкі часопіса?

— Важным складнікам застаецца візуальны вобраз часопіса. Цягам апошніх гадоў «Бярозка» супрацоўнічала са шматлікімі мастакамі, і кожны прыўносіў нешта новае. На дзіва, калі працуеш у камандзе, дзе ўсе гатовы слухаць і чуць, выніковы прадукт пераўзыходзіць самыя смелыя чаканні. Мы імкнёмся, каб візуальна часопіс быў сучасны і ў меру яркі. Улічваем папулярнасць мінімалізму, але кожны нумар робім стылістычна асаблівым, каб ён адпавядаў тэматыцы: містыцы, Калядам, кіберпанку...

Гаворачы пра камандную працу, варта адзначыць, што афіцыйная рэдакцыя «Бярозкі» — пяць чалавек, кожны з якіх, безумоўна, спецыяліст у той ці іншай галіне. Але самае цудоўнае ў гэтых людзях — ген эксперыментатарства. Апроч таго, гэта вялікія энтузіясты, якія хвалююцца за часопіс і хочуць зрабіць яго лепшым. І калі спытаць, хто найгалоўнейшы аматар «Бярозкі», то адказ будзе відавочны: гэта мы, рэдакцыя.

Гутарыла Аліса БРАТКА
Фота даслана Палінай КАРАЛЕВАЙ

Размаітае жыццё

Назва кнігі Міхаіла Мясніковіча не зусім звыклая: «Так было. + Личное». Выпусціла яе выдавецтва «Беларуская навука» напрыканцы 2022 года. Кніга захапіла з першых сказаў, з першых старонак. І не толькі таму, што напісана пачуццёва прывабна, па-чалавечы спакойна, шчыра, але і доказна. Можа, і таму яшчэ, што многія з тых падзей, пра якія піша М.Мясніковіч, давялося перажыць і мне. Чытаў, параўноўваў уражанні, эмоцыі, дзівіўся незвычайнай назіральнасцю аўтара — столькі жыццёвых дэталей і дэталек, многім нябачных, робяць тэкст займальным, вабяць ісці далей. Так, крок за крокам, я ішоў з аўтарам па полі перажытага. Перад вачыма сапраўды ажывалі аздобленыя аўтарскай назіральнасцю і памяццю падзеі, што адбываліся не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве, на прасторах тагачаснага Савецкага Саюза, за яго межамі.



Кніга пачынаецца акурат са знікнення з гістарычнай арэны СССР — «Падзеі, якія ўзрушылі свет». Мясніковічава сведчанне шмат дадае да вядомага нам пра той неадназначна ўспрыняты тады, ды і сёння таксама, час. Але ж не толькі гэта «Так было». Міхаіл Уладзіміравіч як актыўны і неабыякавы дзяржаўны і палітычны дзеяч сапраўды можа расказваць пра перажытае цікава і справядліва, бо сам быў непасрэдным удзельнікам, сам моцна перажываў за не заўсёды адэкватныя патрабаванням часу дзеянні тагачасных уладных структур, асобных дзеячаў розных узроўняў. Неаднойчы асабіста адказваў за арганізацыю і правядзенне тых ці іншых мерапрыемстваў, нават міжнароднага значэння, сам мусіў прымаць тыя ці іншыя рашэнні, што ўплывалі на лёс не толькі Беларусі. Тут ужо не схлусіш і не падфарбуеш пунсовым колерам. Але менавіта ў гэтым — у праўдзівасці, у дакладнасці, у дакументаванасці самая вялікая каштоўнасць кнігі.

Яна пра сапраўды рэальныя падзеі, хоць і падсвечана аўтарскімі эмоцыямі. І гэта не проста пералічэнне фактаў, гэта суперажыванне аўтара, не прыхарошанае, але і не знішчальна-крытычнае. Гаворка чалавека, якому на самай справе балела за тое, што і як адбывалася, які больш за многіх іншых адчуваў тую праўду, якую альбо не хацелі заўважаць, альбо знарок ігнаравалі. Гаворка шчырая таму, што сам ён быў не толькі відавочцам.

Варта прызнаць, што некаторыя аўтары напісанага пра той час альбо не адкрываюць усю праўду, альбо выстаўляюць напаказ саміх сябе, як галоўных стваральнікаў толькі пазітыўнага, аддаючы адмоўную ролю іншым. Мясніковіч не баіцца казаць праўду, не хавае і не прыпудрывае тое, што адбывалася на самай справе, што бачыў сваімі вачыма знутры, з чым не пагаджаўся ён сам ці яго суразмоўцы. Гаворыць і пра тое станоўчае, што адбывалася, і пра нялёгкае, адмоўнае, негатыўнае. Прытым гаворыць шчыра і доказна — не паверыць яму нельга. А ён жа сведчыць і пра складанасці, недапрацоўкі ў некаторых тагачасных уладных структурах, і пра нялёгкі, часам насычаны адмоўнымі эмоцыямі, сённяшні дзень. Не баіцца называць прозвішчы нават самых высокіх асоб, з кім сустракаўся, сутыкаўся, спрачаўся, за каго перажываў, каго падтрымліваў, з кім не пагаджаўся. Пра гэта сведчыць нават назва аднаго эсэ: «Кан'юнктуршчыкі ніколі не будуць сябрамі». Дапускаю, што нешта з выказанага Мясніковічам у некага выкліча іншыя эмоцыі, некаму не ляжа на душу. Але ж гэта натуральна, па-жыццёваму справядліва. На нейкія падзеі аўтар мае свой погляд, чытач — свой. І няхай сабе. Бо, вядома ж, у спрэчцы нараджаецца ісціна. Менавіта з разнастайнасці думак і поглядаў прарастае тое зерне аб'ектыўнасці, справядлівасці і праўдзівасці, якое становіцца асноватворным для рэальнага жыцця рэальнага грамадства.

Дыяпазон інтарэсаў аўтара сапраўды самы шырокі: ад «Малой Радзімы», «Дзяцінства», «Школы. Юнацтва» да «Трыбуны ААН», ад «Мая мама. Жыццё ва ўмовах перамен», «Вайна. Бацька» да «Белы дом. Авальны кабінет. Пентагон», ад «Біяграфічнай навелы» да «Актуальных пытанняў эканомікі і інтэграцыі на сучасным этапе развіцця». Гэта тое, чым было насычана жыццё аўтара, з чым звязана яго станаўленне як асобы, як чалавека, як грамадзяніна, як дзеяча, які думае і клапоціцца не столькі пра сябе, колькі пра дабрабыт, жыццёвую забяспечанасць іншых, зрэшты, пра лёс народа. А ўжо гэтыя якасці паспрыялі таму, што стаў Міхаіл Уладзіміравіч Мясніковіч прызнаным дзяржаўным і палітычным дзеячам, справы якога вядомы і за межамі нашай краіны.

Перажытага, убачанага, асэнсаванага і ўключанага ў агульнаеўрапейскі кантэкст у жыцці Мясніковіча сапраўды шмат. Паўтаруся, не толькі пра станоўчае распавядае аўтар. Жыццё ж нашмат багацейшае і разнастайнае, чаго нельга не заўважаць сапраўднаму патрыёту і клапатліваму рупліўцу на нацыянальнай ніве. Таму, можа, ён не толькі піша пра сябе ці свае эмоцыі, але і аналізуе шмат якія палітычныя, эканамічныя, міжнародныя сітуацыі датычна беларускіх спраў, пацвярджаючы гэта непасрэдна дакументамі, выказваннямі іншых аўтараў. Прычым даводзіць многае ад даўняга часу да дзён сённяшніх. Нават падзеі 2022 года прысутнічаюць на старонках кнігі — «Еўразійскі эканамічны саюз: сёння і заўтра». Я часам нават дзівіўся, як магла чалавечая памяць захаваць многія і многія, здавалася б, драбніцы, малазначныя факты. Але ж з усяго гэтага і складваецца тая праўда, што вабіць чытача, які сам перажыў не толькі той час, але і сённяшняга, які не быў сведкам тагачаснага, а толькі з дакументальных кніг можа даведацца аб днях мінулых. Таму многія зацікаўлена будуць паглыбляцца ў далёкі і не вельмі аддалены час пераўтварэння і перастварэння як самога часу, так і яго творцаў — далёкіх і блізкіх, сваіх і замежных. Старонак жа ў кнізе не так ужо і мала — амаль 600, ды яшчэ прыкметнага фармату. Так што можна ўявіць, колькі перажытага ўклаў аўтар у напісанае, у тое, што не цьмее з часам, змушае казаць праўду, каб не забылася, не ператварылася ў несправядлівую легенду. У гэтым бачыцца мне адна з каштоўнасцей і неаспрэчная карысць кнігі М. Мясніковіча.

Тое ж можна сказаць і пра сімвалічны сэнс назвы кнігі: «Так было. + Личное». Бо і сапраўды, аўтар піша пра тое рэальнае, што было, што адбывалася. Але пры гэтым падсвечвае ўласнымі эмоцыямі, падае і як факт, і як асабіста перажытае, асабіста асэнсаванае, прапушчанае праз сэрца, а не прагматычна безэмацыянальную канстатацыю. І наадварот, у тым асабістым, якое менавіта такім лічыць аўтар, нават у расповедзе пра сваіх родных, бацькоў, аднасямейнікаў, сваякоў, суседзяў, сяброў, калег, паплечнікаў, аднавяскоўцаў столькі факталагічна цікавага і карыснага, і тут жа — важкае, важнае не толькі для сябе самога: «Хто мы? Беларусь: культура і дзяржаўнасць», «Беларусь і Міжнародны валютны фонд, група Сусветнага банка», «Трыбуна ААН», «Беларусы ў Антарктыдзе», «Беларуская атамная», «Будаўніцтва мемарыяла "Брэсцкая крэпасць-герой"»… Зноў жа — не адвольны, не з чужых слоў аповед, а тое, да чаго дакранаўся Мясніковіч уласным жыццём. Пра тое, што яму шанцавала на многіх цікавых і мудрых спадарожнікаў па жыцці, сведчаць шчырыя згадкі, добрыя словы ў адрас многіх і многіх. Але ж гэтыя добрыя словы трэба ўмець сказаць. У Міхаіла Уладзіміравіча атрымліваецца гаварыць шчыра, сумленна, доказна. Пацвярджае сказанае прыкладамі сваіх уземаадносін і ўзаемадачыненняў як па жыцці, так і па працы.

Некаторыя аўтары напісанага пра той час альбо не адкрываюць усю праўду, альбо выстаўляюць напаказ саміх сябе, як галоўных стваральнікаў толькі пазітыўнага, аддаючы адмоўную ролю іншым. Мясніковіч не баіцца казаць праўду, не хавае і не прыпудрывае тое, што адбывалася на самай справе, што бачыў сваімі вачыма знутры, з чым не пагаджаўся ён сам ці яго суразмоўцы. Гаворыць і пра тое станоўчае, што адбывалася, і пра нялёгкае, адмоўнае, негатыўнае. Прытым гаворыць шчыра і доказна — не паверыць яму нельга.

Падкупляе шчырасць выкладзенага, нават пэўная спавядальнасць. Як сцвярджае Міхаіл Уладзіміравіч, ён не прыхільнік пафасных слоў, дзеянняў напаказ. Таму не ўзносіць на недасягальны пастамент нават самую праўдзівую праўду, пра якую піша. Ён хоча, каб чытач зразумеў і пранікся той праўдай, якую бачыў і перажыў сам, што дапаможа больш глыбока разумець і больш справядліва адносіцца да многіх старонак нашага асабістага і грамадскага жыцця ў недалёкім мінулым. А часта нават у далёкім, бо я з вялікай цікавасцю чытаў, напрыклад, старонкі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці Тадэвуша Касцюшкі. І не толькі яго. Дарэчы, аўтар ахвотна звяртаецца да падзей, якія даўно мінулі, аднак дагэтуль уплываюць не толькі на беларускі побыт, але і міжнародны. Ён нават пра тое далёкае гаворыць не казённымі, безэмацыянальнымі словамі, а са сваім асабістым разуменнем, самога аўтара — каб не сумняваліся ў праўдзівасці сказанага, каб не палічылі за аўтарскую карэкцыю. Таму дакументы падаюцца як ксеракопіі арыгіналаў. Добра дапаўняюць тэкст здымкі з размаітага жыцця аўтара і яго калег. Усё гэта ў сукупнасці даволі пераканаўча і доказна сведчыць пра адметнасці нашай зямлі, пра наш край і нашых людзей, якія сапраўды ўмелі жыць — і жылі — у еўрапейскім хаўрусе, мелі там сваю пашану, свае адметнасці. Як справядліва падкрэслівае Міхаіл Уладзіміравіч, «Беларусь не была "забітым" краем, яна дала свету шмат герояў, і нам ёсць кім ганарыцца».

Ёсць у кнізе і тыя старонкі, што асабліва кранаюць маю памяць, бо яны прысвечаны нашай даўняй ужо маладосці — «Школа. Юнацтва». Некалі, у 1966 годзе, я закончыў Сноўскую сярэднюю школу, пра якую з прыхільнасцю піша М. Мясніковіч, на год маладзейшы выпускнік гэтай навучальнай установы. Прачытаў я тыя старонкі і па-добраму здзівіўся заўважанаму аўтарам, падабенству нашых эмоцый ад тых дзён і гадоў. Гэта датычыць і вучнёўскіх паводзін, і нашых настаўнікаў, і заканчэння школы, і паступлення на далейшую вучобу, і студэнцкага будаўнічага атрада, і іншага. А яшчэ таму, як умее ён казаць пра сваіх аднакласнікаў, пра тагачасную атмасферу, пра карысныя справы настаўнікаў.

Нельга не пагадзіцца з М. Мясніковічам, калі ён піша (прывяду ўрывак на мове арыгінала): «Национальное достояние — это прежде всего люди со своими радостями и горестями. Задача не только государства, но и каждого гражданина — укрепить наше единство. Никому за пределами Беларуси мы не станем родными. Родственные узы — это крепость страны. В обиходе — понятие "гражданское общество", которое должно сотрудничать с государством. Считаю, что не сотрудничество, а совместное решение внутренних и внешних задач и противостояние вызовам — это общее дело и государства, и каждой семьи, и каждого гражданина. Нам нечего делить, у нас одна страна — наша Беларусь, и мы должны делать все от нас зависящее для ее благополучия. Будет хорошо в стране — будет хорошо каждому».

Хай жа так і станецца.

А таму, выходзячы з вышэйсказанага, хацелася б выказаць словы ўдзячнасці за шчыра напісанае найперш самому аўтару. А таксама выдавецтву «Беларуская навука» за цікавае і грунтоўнае выданне.

Анатоль БУТЭВІЧ

Пад беларускім сонейкам

Напярэдадні зімовых свят і школьных вакацый сапраўдным падарункам ад Выдвецкага Дома «Звязда» юнаму чытачу стаў выхад паэтычнай кніжкі Віктара Шніпа «Кастусь і Міёна». Выданне пабачыла свет з добрым па сённяшнім часе накладам — 1100 экзэмпляраў. Яшчэ з прыемных бонусаў — у творчым тандэме з паэтам выступіла вядомая мастачка Аксана Аракчэева. Ніхто ж не будзе спрачацца з тым, што мастак-афарміцель даўно з'яўляецца суаўтарам дзіцячага выдання? І палова поспеху, у тым ліку і ў рэалізацыі, па праве належыць яму — паплечніку з чароўным пэндзлем у руцэ.

Так, маленькі чытач, трапіўшы ў добразычлівы свет вершаў Віктара Шніпа, вандруе па старонках кніжкі ў суправаджэнні выразных, цёплых і зразумелых малюнкаў. Ужо з вокладкі чытача, а значыць, і сябра, вітаюць разумныя вочы аўчаркі Міёны, пра якую пойдзе гаворка далей, трохі вышэй — карагод будучых знаёмцаў. Вясёлыя, смяшлівыя, пазітыўныя героі кніжкі шчыра запрашаюць да дыялогу. А над усім — беларускае сонейка. Натуральна, калі падтрымаць рыторыку Віктара Шніпа — беларускае неба, беларуская вясна, тады і сонейка можа быць толькі сваім, родным, беларускім.

Мастачка надзвычай удала здолела перадаць гумарыстычны пасыл твораў Віктара Шніпа. Адзін з прыкладаў: на прагулцы ў дажджлівы дзень разумная і вельмі дружалюбная Міёна разам з гаспадаром шпацыруе па лужынах… у гумовых ботах. А ад пільнага позірку тых, каму пашчасціла асабіста ведаць Віктара Анатольевіча, не схаваецца яшчэ адна акалічнасць — глыбіннае бачанне мастачкай унутранага свету паэта. Малюнкі апавядаюць, выпраменьваюць — самая вялікая каштоўнасць для пісьменніка: дружная вялікая сям'я, дзе растуць дзеці, а ў дзяцей ёсць шчаслівыя бацькі, дзядулі і бабулі.

Галоўныя героі, хлопчык Кастусь і аўчарка Міёна, абазначыны ў назве. На першых старонках Віктар Анатольевіч знаёміць чытачоў з імі і перадае асабістае стаўленне да іх. А дасведчаны чытач пра сябе адзначае: лінейная кампазіцыя, добры ход! У першым творы «Кастусь нарадзіўся» аўтар дзеліцца сваім вялікім новым шчасцем: «У месяцы лютым, // Вятрамі прадзьмутым, // Кастусь нарадзіўся // І дом асвяціўся» і «Кастусь нарадзіўся // Марозы трашчалі. // І зоркі ляталі. // І сэрцы спявалі».

Міёну, мару любога дзіцяці, аўтар паказвае дужай і моцнай. А яе характар і памеры вызначае з паэтычнай усмешкай: «Я смела з ёй заўжды хаджу. // Адно баімся мы дажджу. // Няма такога парасона, // Каб там схавалася Міёна».

А ўжо з верша «Кастусь малюе» пачынаюцца не толькі вясёлыя прыгоды сяброў, але і забаўныя непаразуменні.

«Наш Кастусь — мастак натхнёны, // Захацеў партрэт Міёны. // Ён Міёну маляваў, // Дзед Міёну адмываў».

Змест кнігі не абмяжоўваецца аповедам пра сапраўднае сяброўства хлопчыка і сабакі. Даведаемся і пра клопат дзівачкі мухі-трапятухі, радасць зайца, што прыдбаў веласіпед і такім чынам можа ратавацца ад ваўка, а таксама пра пеўня-настаўніка, які нясе адказнасць за неразумных куранят.

Гумарыстычным вершам «Варона і карона» Віктар Анатольевіч мякка, каб не пакрыўдзіць, раіць маленькаму чытачу ніколі не ўзносіць сябе, быць сціплым і вельмі пільным у самаацэнцы. Бо ў іншым выпадку ёсць шанц зрабіцца падобным да дурніцы вароны, якая патрабуе сабе карону.

Каб маленькі чытач мог паглядзець на свае паводзіны збоку і, пазнаючы сябе, зрабіць выснову, аўтар наўмысна перакладае віну за згублены буквар… Канешне, на ката! На таго, хто дома першы трапіцца пад руку, калі трэба адказваць перад старэйшымі за правіннасць.

Спадабаецца дзецям і гісторыя пра дзеда мядзведзя, якога не змагла збіць з панталыку сваімі хітрыкамі ліса. Мудры мядзведзь не павёўся на парады вядомай падманшчыцы і інтрыганкі, а паслухаў ляснога доктара барсука. Дзед прынёс хвораму ўнуку ў якасці лекаў калоду карыснага мядку. І маленькаму чытачу не трэба сумнявацца, што мядзведзік хутка папраўбіцца. А як жа інакш, калі побач клапатлівы дзед!

Для Віктара Шніпа ў свеце дзяцей няма другасных пытанняў. Яго хвалюе літаральна ўсё: хто сапсаваў настрой танцорам-камарам і чаму злуюцца мышы, якія набылі на лясным базары лыжы, а цяпер бядуюць, як зацягнуць пакупку ў норку? А ў вершы «Хто пакрыўдзіў хмурынкі» паэт спачувае незаслужана абражаным хмаркам і дзяўчынцы Святланцы, што зрабіла гэты непрыгожы ўчынак.

P. S: Нягледзячы на тое, што выданне адрасавана дзецям, на мой погляд, яно выкліча інтарэс і ў сур'ёзнай дарослай аўдыторыі. Хіба ж не цікава пасля дзённікавай прозы паглядзець на Міёну з іншага ракурсу?!

Іна ФРАЛОВА

Падарожжа для юных натуралістаў

Сапраўдным падарункам не толькі дзецям, але і іх бацькам стала кніга Віктара Кажуры «Энцыклапедыя юнага натураліста», якая выйшла ў выдавецтве «Народная асвета». У прадмове аўтар гаворыць, што «ўсё напісанае — гэта і імкненне пазнаёміць чытачоў з карысным і каштоўным прыродным багаццем нашай краіны, і жаданне падзяліцца кулінарнымі рэцэптамі ад гэтага багацця, і прапанова расказаць пра свае нечаканыя сустрэчы, знаходкі і адкрыцці на лясных сцяжынках, на аксамітных лугах, у блакітных рэках і азёрах».

Адметнае выданне тым, што аўтар (а ён — настаўнік беларускай мовы і літаратуры Вілейскай гімназіі № 2) раскрывае сакрэты прыроды перш за ўсё на матэрыяле роднай Беларусі.

Складаецца кніга з трох раздзелаў. Першы «Ягады і кветкі — сонейкавы дзеткі» апавядае пра дзівосных, прыгожых і смачных насельнікаў нашых садоў, агародаў, лясоў. Кожны новы артыкул пачынаецца вершаванымі радкамі, у якіх вызначаецца «аб'ект» і малюецца яго «мастацкі партрэт»:

Як брацікі пушыстых аблачынак,
Укрылі поле шчодра дзьмухаўцы.
А вецер дакранецца да чупрынак —
Пушынкі паляцяць ва ўсе канцы.

Затым падаецца апісанне самой расліны, яе выгляд, месца «жыхарства», час росту і цвіцення. Да таго ж вы атрымаеце карысныя парады, дзе, калі, якія ягады збіраць, даведаецеся, якія лекавыя расліны дапамагаюць ад тых ці іншых хвароб і калі іх лепш нарыхтоўваць. Прачытаеце незвычайныя легенды-апавяданні пра кожную расліну.

А яшчэ ў гэтым раздзеле пісьменнік дзеліцца кулінарнымі рэцэптамі (часам даволі незвычайнымі!), якія падказалі яго ўнукі.

Чытаючы далей, вы разам з аўтарам пройдзеце па лясных сцяжынах, раскрыеце сакрэты грыбнога царства. Каб не памыліцца ў выбары ядомых грыбоў і не нашкодзіць сабе, у раздзеле «Бору-лесу будзь удзячны: пакланіся — ён аддзячыць!» аўтар прапануе шмат карыснай і патрэбнай інфармацыі.

Раздзел «І на лузе, і ў бары ёсць свае гаспадары» знаёміць з жывёльным светам, а таксама з паўзунамі і насякомымі. Ці ведаеце вы, напрыклад, што не ўсе камары кусаюцца? Аказваецца, балючыя «ўколы» толькі ад самак, а самцы даволі бяскрыўдныя: яны кормяцца кветкавым нектарам.

Для заядлых рыбакоў — мноства падказак пра насельнікаў нашых вадаёмаў: пра звычкі і месца жыхарства рыб, іх «партрэты».

Акрамя ўсяго, у «Энцыклапедыі…» вы знойдзеце шмат ілюстрацый, якія дапамагаюць юным натуралістам (ды і не толькі ім) вывучаць і карыстацца бясцэнным прыродным багаццем нашай краіны.

Ірына КАРНАЎХАВА

Не дзявочая гэта справа…

Шчырая, смелая і смешная — такой атрымалася новая кніга пісьменніцы Валянціны Быстрымовіч. Аповесць «Шкодніцы», напісаная на рускай мове, выйшла сёлета ў Выдавецкім доме «Звязда».

У цэнтры гісторыі — прыгоды дзвюх маладых дзяўчат Іванкі і Галкі. Гераіні жывуць у Рабочым пасёлку на ўскраіне Магілёва. Вакол школьніц-шкодніц віруе жыццё, бо яны лічаць, што могуць усё. Сярод іх подзвігаў — кравецкімі нажніцамі зрабіць модную стрыжку, ноччу пайсці на могілкі, каб даказаць сваю смеласць, пры гэтым скрасці магільны крыж і паставіць яго ў двары суседа, пабіцца за гонар іншай дзяўчынкі з задзірай класа, выскачыць з цягніка, каб раней трапіць дадому.

Калі і падаюцца камусьці гэтыя гісторыі дзіўнымі і зусім не дзявочымі, то варта даведацца пра галоўную мару Галкі і Іванкі — стаць лётчыцамі альбо, у крайнім выпадку, капітанамі далёкага плавання. А на шляху да сваёй мары гераіні кнігі гатовы вучыцца, перамагаць і быць наперадзе ўсіх.

За мастацкае афармленне кнігі адказвала Алеся Зяновіч. Ілюстратарка падышла да справы незвычайна. На старонках «Шкодніц» мы сустрэнем не звыклыя малюнкі, а чорна-белыя калажныя кампазіцыі. Карпатліва сабраныя выявы і фотаздымкі дадаюць аповесці атмасферу тых гадоў, што робіць чытанне лягчэйшым.

Валянціна Быстрымовіч вытрымлівае пэўны тэмп аповеду і не здраджвае свайму пісьменніцкаму стылю. Кніга складаецца з асобных раздзелаў, дзе Галку і Іванку сустракаюць усё новыя прыгоды. Як і ў іншых сваіх творах, аўтар не проста апавядае, а адсылае чытача да канкрэтнага перыяду жыцця гераінь, да часоў, якія мінулі.

Якары часу — і ў самім тэксце. Так, самая модная стрыжка ў школьніц таго часу — гаўрош. У кінатэатрах галоўны фільм — «Брыльянтавая рука». Для таго каб дастаць пэўны прадукт, трэба выстаяць вялікую чаргу ў краму.

Раздзел «Клёвая новенькая» — адна з вызначальных частак кнігі. Сутыкненне Галкі і Іванкі з новым, невядомым тыпам чалавека прыводзіць іх у стан поўнай разгубленасці. Адказная і інтэлігентная Наташа не стала сяброўкай для гераінь, аднак, безумоўна, акрэсліла іх жыццёвыя арыенціры, як пакажа далей гісторыя.

Асаблівай увагі варты раздзел пад назвай «Рабінавая ноч». У ім, насычаным містычнымі элементамі, апісваецца фарміраванне асоб дзяўчат.

Магілёў Валянціны Быстрымовіч тых часоў паўстае перад чытачом месцам няпростым. Галка і Іванка імкнуцца бачыць толькі пазітыў, але адмоўныя бакі немагчыма схаваць, бо беднасць і алкагалізм зусім побач. Напрыклад, ёсць раздзел, які распавядае пра першы досвед курэння.

Калі на пачатку кнігі мы сустракаем дзвюх гарэз, якія гатовы на любыя авантуры, то ў фінальных частках перад намі паўстаюць маладыя дзяўчаты. Усё такія ж смелыя, але з адкрытымі, чыстымі сэрцамі. У апошнім раздзеле, які называецца адпаведна — «Сталеем», галоўная гераіня сутыкаецца з невядомым дагэтуль пачуццём — першым каханнем.

Яна ЦЭГЛА

«Захад яшчэ ў пазалоце, ружа зары дацвітай!»

Віктар ГАРДЗЕЙ

Паслялецце

З палеткаў рынулі валошкі,
І лета тлумнае сышло.
Тут уздыхнуць, паплакаць трошкі:
А можа, іх і не было?

Хлеб аржаны з усіх набыткаў
Вышэй ацэнены людзьмі.
Ручнік бялюткі жнівень выткаў —
Ты ж, вецер, з поўначы не дзьмі!

Валошкі, жыта, перапёлкі —
Адвечны поля атрыбут,
Ды толькі голыя прасёлкі
Не прывядуць у дзедаў кут.

На сэрцы ледзьве паспяваю
Чарговае залатаць шво.
З калоссем спеўным дзесьці з краю
Маё ўжо кволіцца жніво.

А я люблю…

Ісці далей, хоць не палічыш крокі,
І на плячы ёсць месца кашалю.
А я люблю нябёсы і аблокі,
Таму вось і жыву, што іх люблю.

Каб узляцець, усё ж патрэбны крылы
І там, у Эмпірэях, — сінява.
Знікай, настрой, самотны і панылы,
Жыццё тваё —
зусім не трын-трава.

Маўкліва птушкі з выраю ляцелі,
І жураўлі крычаць усё радзей,
А я люблю адчайны гул мяцеліц —
Ісці далей, ісці мне да людзей.

Павер'е ёсць: жывых вяснянка кліча,
Не адгукайся ёй, і мы дайшлі!
Адкуль яно бярэцца таямніча,
Рыззё жыцця ў дарожным кашалі?

Нябёсы і душа —
ім жыць у згодзе,
Яна ўсё тая ж, як яе не ўзнось.
А я люблю стаяць на мокрым бродзе,
Калі сяброўцы з пушчы трубіць лось.

Ноч

Слухаю ноч, і не раз,
Ноч гэта поўная гукаў:
Нехта пастукаў, пагрукаў —
Руху жывы пераказ.

Не зразумееш ніяк:
Колер у ночы — атрамант?
Енк усчынае і лямант
Птушка начная — ляляк.

Вухнуў пугач, і бугай
Роўма раве на балоце.
Захад яшчэ ў пазалоце,
Ружа зары, зацвітай!

Свежа і росна. Туман.
І бліскавіцы з-пад хмары.
Быццам павіс на радары
Містыкі рыцар — кажан.

Лысай гары жыхары:
Ведзьмы і плойма нячыстых.
Бачылі вы трактарыстых
З плугам ля Лысай гары?

Ноч, ты ў лясах не суроч:
Мучаць з сурокаў хваробы.
Мне ж, як заўжды, даспадобы
Цёплая, зорная ноч.

Смага кнігаўкі ў спякоту

Спрабавалі нашы птушкі хорам —
Спеў рассыпаўся на галасы.
Гэта кнігаўка свет возьме зморам,
Толькі даць ёй кропельку расы.

Як дзялілі вільгаць па ўсім шары,
Не крапіла ніўкі і груды.
Не мінула каня Божай кары:
Смага мучыць блізка ля вады.

З прытопу, з прытупу, з падскоку
Вяселле шуміць у двары.
Танцораў падсмейваюць збоку
Суседніх двароў штукары.

Чаго тут малому ажыгу,
Што ноч прастаіць напралёт?
Хачу я пірацкую джыгу,
А чую чуллівы факстрот.

Мелодыі без перапынку:
Гуляе Малое Сяло!
— Давай памяняемся, сынку,
Бо сутаргай пальцы звяло.

Абмен іх не дужа грувасткі,
Яшчэ і падпелі, наўздзіў.

Фота Кастуся Дробава.

Праляцела з апантаным плачам
Росны выган, рэчку, сенажаць,
Ды замоўкла апаўдні гарачым —
Бог умее птушкам дараваць.

Кнігаўку вы, пэўна, чулі ўранні,
А ў той год і жыта недабор.
Трапіла ў легенды і паданні,
Але гэта родны наш фальклор.

Тралі-валі

Вітанне, юнацтва сяброк,
Ды розныя там тралі-валі!
Адбілася дзеўка ад рук:
Яе мы адну цалавалі.

Пякучае зелле — тытунь
Ахоўныя мае акцызы,
Але табакерку адсунь,
Бо дым не ўтаймуецца шызы.

Якую хто ўбачыць віну
І скуль мітусня і зняверка?
Бясспрэчна: адну дык адну,
Ды іншай была табакерка.

Ці дождж, ці завея мяла,
Ва ўсім вінавата субота.
Пазнакі Малога Сяла:
Нуда, адзінота, гаркота.

На кон ці ўзбрыло б галаве
Паставіць дзявочыя вусны?
Таму ён зрэдзьчас ажыве,
І наш мілы кут захалусны.

Музыкі Малога Сяла

Над поплавам ветрык павеяў,
Бяруць інструменты лацвей
Музыкі Валодзя Мацвееў
І тата ягоны — Мацвей.

Заплакала скрыпка адразу,
Зажураны акардэон,
А бубен латошыць як вазу,
Зрэдзьчас патрапляючы ў тон.

Вяселле на пары, на часткі
Зух-бубен, як вазу, разбіў.

Ды што ён прыціх, забубенны?
У хату падаўся бубнач.
Жаніх недаступна-каменны,
І ты, маладая, не плач!

Па слядах даўніх анімацый

1

Зайкі скачуць танга
На глыжы, на пні.
Лясне бумерангам —
Цеціву напні!

Як ты лук не мацай,
У стралы — сакрэт.
Даўніх анімацый
Насмяшыў сюжэт.

2

Лес, і куралеса
Навылёт прадзьме.
Воўк, прабеглы лесам,
Жаліцца зіме:

— Я адзін, бязродны,
Думу думаю,
Думаю, галодны,
Пра бяду маю.

Зайкі ўсе паснулі,
Толькі я не сплю.
Дзе той двор бабулі?
Козліка схаплю!

3

З цёмнага закутка,
І без мітульгі,
Цыркуль вылез хутка,
А за ім — другі.

Іх самаахвярны,
Хто ў сюжэт заплёў?
На стале слясарным
Скокі цыркулёў.

З розным выкрунтасам,
«Антраша», тут «па»,
І дынамік басам
Спеў ім са слупа.

Смех у кіназале,
Рогат быў, калі
Са стала спаўзалі
Потырч цыркулі.

Віктар ЯРАЦ

Лесвіца без адказаў

І з чаго цяпер птахі малыя
будуць віць свае гнёзды — не знаю.
Ю. Марцінкявічус

Што хацеў Юсцінас Марцінкявічус
на гарышчы свайго дома адшукаць —
невядома тое анікому.
Лесвіца маўчыць. А ці маўчала
і ў той міг, калі з яе прыступак
ногі скаўзануліся і рукі
апусцілі неба на зямлю?
І сасна, якая ўмела ў лесе
для яго смяяцца па-літоўску,
дзень той ценем доўгім,
скрушным ценем
назаўжды пазначыла.

А зоркі высыпалі густа прычасціцца
над вірамі развітанняў Нёмана.
Лесвіца маўчыць,
як вінаватая.
Чуйны бор —
вякоў раяль паранены —
з вышынёй прыціхлай гукі сватае:
— Юс-ці-нас…

* * *

Памяці Алеся Разанава

На канвертах выцвілыя штэмпелі
і на пісьмах аніякіх дат.
Памяць, раскруці свае прапелеры,
абудзі сляды на трасах страт.

Не красворды тут неразгаданыя:
сцежкі і шляхі,
дзе спёка й золь,
дождж са снегам…
Літар вязь — расстаннямі.
А ці б'ецца ў сэрцы неба
чалавека боль?

* * *

Тэлефонныя будкі адна за адной
пазнікалі — не знойдзеш і следу
ні зімою, ні летам.
Не пачуеш маўчання ў трубцы —
пудовае гіры цяжэй.
Век адчаліў стары
не ў баркасе, не ў шлюпцы —
тэлефоннымі будкамі
з металічнымі сценкамі,
з цеплынёй неастылых надзей.

Законапаслухмяны чалавек

Навела

Георгій МАРЧУК

Зіма. Законапаслухмяны сарака-гадовы вадзіцель маршруткі Іван Шульга ў шэсць гадзін раніцы выехаў на маршрут. У невысокага, каржакаватага Івана сумныя вочы, мажліва, і не надта сумныя, а больш насцярожаныя, нібыта чалавек нечым незадаволены, раздражнёны. Іван жыве ў сталіцы, пераехаў адразу пасля службы ў войску. Яго бацькі — у вёсцы, каля раённага горада Лагойска, што за трыццаць кіламетраў ад сталіцы. Яны на пенсіі. Бацька Івана сорак пяць гадоў аддаў службе ляснічым. Гэта быў чалавек негаваркі, строгі, які кіраваўся ў жыцці двума словамі: патрэбен «закон і парадак» ва ўсім. Узяў, скажам, шклянку з буфета, каб наліць малака, — вярні на месца.

З маленства прывучыў да дысцыпліны і адказнасці і свайго адзінага сына. Маці, сціплая і працавітая жанчына, загадвала вясковым фельчарска-акушэрскім пунктам. Яна, як кажуць, танцавала вакол свайго любімага сыночка і часта рабіла за яго работу, якую таму даручаў бацька.

Можа, ад гэтай мацярынскай апекі Іван рос трохі лайдаком. Не паехаў паступаць вучыцца далей, прызвалі пасля школы ў войска, дзе яго вывучылі на шафёра. Талент у яго да гэтай прафесіі быў, заўважылі. Падчас службы вазіў камандзіра вайсковай часці. Умеў трымаць язык за зубамі. Ён адзін ведаў, што падвозіць свайго камандзіра час ад часу да палюбоўніцы ў сталіцу. Горад яму спадабаўся, таму пасля дэмбеля ўладкаваўся вадзіцелем у кадастравае ўпраўленне і аб'ездзіў амаль усю Беларусь. Не спяшаўся жаніцца, жыццё халасцяка падабалася, але гэта з часам назаляла сумам ад адзіноты. Маці сасватала сыну яго былую аднакласніцу Ніну, якая была замужам, але разышлася. Сабралі з усіх сваякоў грошы, узялі крэдыт і пабудавалі двухпакаёвую кватэру ў новым мікрараёне сталіцы.

Жылі дружна, без сварак. Адно замінала: Бог не даў ім дзетак. «Калі разбагацеем — возьмем з дзетдома», — казаў Іван. Разбагацець усё ніяк не атрымлівалася. Не было ў яго характары жылкі бізнесмена. Пайшоў працаваць на маршрутку і марыў набыць з часам ва ўласнасць свой мікрааўтобус. Іван ведаў, як жыруе гаспадар, які валодае аж чатырма маршруткамі. Недзе ж ён узяў грошы, каб іх набыць.

А тут яшчэ насунулася з усходу навала каранавіруса, які і прымусіў людзей схаваць свае твары за маскамі. Не чакаючы загадаў зверху, асцярожны Іван прасіў пасажыраў у сваёй маршрутцы быць абавязкова ў масках. Асцерагаўся хваробы, і яна пакуль яго мінала.

У гэты снежны дзень без асабліва прыўзнятага настрою вёз пасажыраў па знаёмым маршруце ў прыгарад сталіцы. На ўскрайку горада ўзняў руку падлетак гадоў дванаццаці-чатырнаццаці. Іван быў рады кожнаму пасажыру...

Калі іх збіраўся поўны салон, тады ў Івана быў прыўзняты настрой, і ён пачынаў бубніць пад нос якую-небудзь песню. Праехалі амаль кіламетр.

Іван чакаў, а хлопец не перадаваў грошы за праезд.

— Аплачваем праезд, — гучна нагадаў Іван сваім густым барытонам.

Хлопчык, аднак, сядзеў нерухома.

«Пацан бязвусы, дражніцца ці што?!» — пачынаў злавацца Іван.

— Хто яшчэ не заплаціў, — зноў больш строга нагадаў з нотамі злосці ў голасе Іван.

— Усе заплацілі, — адказала ўзбуджаная невядома з якой прычыны жанчына.

Іван націснуў на педаль тормаза.

— Малады чалавек, будзеш плаціць ці не? — звярнуўся ён да падлетка.

Хлопец разгубіўся:

— У мяне няма грошай. Даруйце... — нарэшце адказаў ён.

— Прашу пакінуць салон!

У голасе Івана чуліся гнеў і злосць.

Хлопец моўчкі выйшаў з салона на дарогу ў голым полі. У аўтобусе было ціха. Дзве дзяўчыны, уваткнуўшы ў вушы навушнікі, слухалі музыку. Мужыкі на задніх крэслах драмалі, дзядок у выцвілай ушанцы глядзеў у акно. Адна мажная жанчына, якая жавала булачку, выказалася: «Гультай».

Ніхто, аднак, на яе словы не адрэагаваў. Такое адчуванне, што ў пасажыраў няма ахвоты ні слухаць нікога, ні абмяркоўваць нічога. Вяртаўся назад у сталіцу Іван у добрым настроі. Салон быў поўны пасажыраў. Грашовы выдаўся дзень. Вяртаючыся, Іван інтуітыўна прыпыніўся на тым месцы, дзе высадзіў хлопца. На дарозе, на полі нікога не было відаць. Пачыналася завіруха, ад колкага ветру мацнеў мароз. Толькі над лесам супраціўлялася ветру адзінокая варона. У салоне Іван пацікавіўся ў пасажыраў.

— А што за гэтым лесам? Ёсць там людзі?

— Маленькая вёсачка, — адказаў адзін.

Добры дзень выдаўся. І жонка пачаставала яго на вячэру смачнымі калдунамі, якія Іван надта ж любіў. Нешта нічога цікавага па тэлевізары не паказвалі. Таму Іван хаатычна пераключаў з канала на канал.

— Супакойся. Дай хоць што-небудзь паглядзець, — прасіла жонка.

— Хоць бы якую камедыю паказалі, — адказаў Іван і пайшоў на кухню курыць.

Жонка заўважыла змену ў яго настроі. А ў Івана не выходзілі з галавы думкі пра хлопчыка, якога ён высадзіў з маршруткі. Ляжалі ў пасцелі моўчкі. Іван не спаў. Жонка адчула, што нешта з ім не так, пацікавілася.

— Ваня, што здарылася? — асцярожна так спытала яна, ведаючы яго нораў.

Ён не любіў, калі настырна лезуць у душу. На гэты раз Іван спакойна расказаў жонцы пра выпадак у маршрутцы.

— А божа мой, гэта ж грэх! — з адчаем сказала жонка.

— Парадак ёсць парадак. Для ўсіх. Закон і парадак. Калі будзем саступаць, што тады? Хаос, — шукаў апраўданне Іван.

— Я казала табе: вазі ў салоне абразок Божай Маці. Як непрыемна! Гэта ж дзіця! А калі змерз дзесь? Маліся Богу, Ваня, прасі дараваць, і я буду маліцца, — не магла супакоіцца жонка.

— Добра, добра. Супакойся. Спі.

— Тут заснеш. Божа... Які жорсткі свет пайшоў. Робімся злымі, — нібы сама сабе казала жонка.

Іван спаў дрэнна, а раніцаю патэлефанаваў свайму напарніку і папрасіў выехаць на маршрут замест яго. Сам жа з цяжкасцю завёў сваю старэнькую «таёту» і паехаў на тое поле, дзе высадзіў падлетка. А раптам хлопец загінуў у лесе дзе-небудзь? Ад думак такіх аж сэрца ёкнула. Кінуў машыну на абочыне і пайшоў у бок лесу да вёскі. «За гэтыя два рублі... зняважыў толькі сябе», — дакараў сябе Іван. У лесе снегу было значна больш, чым у полі, лес густы. «Маглі тут і ваўкі быць» — ад думак аж уздрыгнуў, паскорыў крок. Праз хвілін дваццаць выйшаў да вёскі. Старыя драўляныя хаты саступалі месца камяніцам, новым катэджам. Дзе шукаць гэтага худзенькага хлопчыка? Адна доўгая вуліца. Яму пашанцавала: адна жанчына ў вялікіх не па памеры валёнках выйшла з варот з вядром і накіравалася да калонкі.

— Добры дзень! Даруйце, калі ласка. Я вадзіцель маршруткі. Учора ехаў хлопчык у белай куртачцы. Выйшаў у полі... Пайшоў да вёскі... Вось... У маршрутцы ён забыў... о... здачу я яму не аддаў з дзесяці рублёў. Мо падкажаце, дзе жыве? Заплечнік сіні яшчэ.

Жанчына як ні дзіўна, паверыла Івану.

— А, дык гэта, мусіць, Ванька, Падабеда сын. Вунь іх хата, — паказала жанчына. — Вунь дзе жыве. Маці адна яго выхоўвае. Добры хлопчык. На баяне іграе. Ездзіць у музычную школу.

Іван не адразу адчыніў фортку, затрымаўся, закурыў. Сустрэла яго не надта каб насцярожана, але з прыкметнай увагай жанчына сярэдніх гадоў з прыгожымі рысамі твару.

— Добры дзень! Ваня тут жыве?

Жанчына насцярожылася.

— Тут. А што здарылася?

Ваня, які пачуў размову маці з незнаёмцам, выйшаў са свайго пакоя.

— Ваня. Гэта я, вадзіцель маршруткі... які высадзіў цябе на полі, — пачаў Іван.

— Ваня? — маці павярнулася да сына.

— Мама, я не змог заплаціць... — пачаў апраўдвацца трохі напалоханы Ванька.

— Праходзьце, сядайце, — прапанавала зніякавелая жанчына. — Я зараз... Мы заплацім.

Яны з калідора ўвайшлі ў невялікі пакой. Іван сеў на табурэтку. Жанчына пачала шукаць свой кашалёк.

— Я прыйшоў не па грошы. Як вас па бацьку?

— Лідзія Рыгораўна.

— Лідзія Рыгораўна, я грошы не вазьму. Я так... каб сустрэцца са сваім цёзкам. Я вінаваты, Лідзія Рыгораўна, вінаваты перад вашым сынам.

— Гэта ён вінаваты…

— Не. І перад ім, і перад Богам я адзін вінаваты. Ваня, падыдзі да мяне бліжэй... Не бойся.

Ванька зрабіў два крокі.

— Бліжэй... не бойся.

— Падыдзі, сынок, — супакоіла сына маці.

— Вось што, Ваня, удар мяне па твары.

І Ванька, і маці збянтэжыліся ад пачутага.

— Не палохайся, я ж не вар'ят. Так падказвае мне маё сэрца. Не бойся, бі, — настойліва прасіў Іван.

Ванька злёгку ўдарыў вадзіцеля па шчацэ.

— Мацней. Ты ж мужык. Давай.

І Ванька ўдарыў яшчэ раз.

— Так трэба, Лідзія Рыгораўна.

Узнікла непрыемная паўза.

— А цяпер дай пяць. Міравую, — Іван працягнуў Ваньку сваю шырокую далонь з тоўстымі пальцамі. Ванька асцярожна падаў і сваю худую руку, на якой, здавалася, прасвечваліся костачкі пальцаў.

— Даруй мне, цёзка! Даруй!

Нешта вельмі значнае, незнаёмае высвецілася ў душы законапаслухмянага вадзіцеля. Ён хутка пакінуў хату, каб не заплакаць.



Фота Кастуся Дробава.

Наўрад ці хто не ведае песні «Жураўлі». Яна, па сутнасці, народная. Не ўсе могуць назваць аўтара. «Забываюць», што словы напісаў Расул Гамзатаў. Тым больш няўцям многім, што перакладчык з аварскай мовы на рускую — яго сябра Навум Грэбнеў. А музыка вядомага кампазітара Яна Фрэнкеля. І што ў арыгінале не салдаты загінулі ў баях за Радзіму, а джыгіты. У адным толькі нікога не падводзіць памяць: найлепш спявае народны артыст РСФСР Марк Бернес. Але і тут не абысціся без удакладнення. Гэта была апошняя песня, запісаная ў выкананні Марка Навумавіча: «Мне кажется порою, что солдаты, // С кровавых не пришедшие полей, // Не в землю нашу полегли когда-то, // А превратились в белых журавлей».

У гэтай жураўлінай чарадзе ёсць і яшчэ два беларускія паэты, звестак пра якіх захавалася мала, няшмат дайшло і твораў. Таму ў аповедзе не абысціся без сведчання тых, хто добра іх ведаў.

Сарамлівы і заўсёды ветлівы

У згаданым зборніку ёсць і творы Уладзіміра Рагуцкага. Прадстаўлены яны таксама ў калектыўных кнігах «Крывёю сэрца» (1967) і «Покліч долі адзінай» (1979). Аднак пра гэтага паэта, з якога, несумненна, вырас бы сапраўдны майстар слова, зместкі яшчэ больш скупыя, чым пра Янку Бобрыка. Вядома, што нарадзіўся 9 снежня 1917 года ў сям'і настаўнікаў, якія жылі ў вёсцы

На імклівых водах нашых
Будзе шлях твой да пары:
Мае мары разгадаўшы,
Спыняць дзесь цябе сябры.

Звераць поглядам любоўным…
І тады — у іх руках —
Станеш скрыпкаю цудоўнай,
Небывалай у вяках.

Як успрынялі студэнты гэты твор, апавядае ў сваіх успамінах «Паэт і чайка» Мікола Аўрамчык: «Аляксей Коршак хадзіў па інстытуцкім калідоры і на памяць чытаў яго верш "Хвоя"».

Курлыканне журавоў і чаек крык

Плыў да светлых дзён

У згадках пра Янку Бобрыка неацэнны памочнік Сяргей Грахоўскі, які быў яго стрыечным братам. Янка Бобрык нарадзіўся 21 ліпеня 1905 года ў мястэчку Глуск Бабруйскага павета Мінскай губерні. Цяпер гэта гарадскі пасёлак, цэнтр аднаго з раёнаў Магілёўшчыны. Сяргей жа Іванавіч, як вядома, родам з сяла Нобель колішняга Пінскага павета, на той час таксама Мінскай губерні (цяпер гэта Ровенская вобласць Украіны). Аднак яго маленства і юнацтва прайшло ў Глуску.

Янка Бобрык.

Янка з ранніх гадоў далучыўся да цяжкай працы. Лёгкай яна і не бывае ў кавала, а яго бацька ў гэтым рамястве славіўся на ўсю акругу. Сын жа, адкуль і сілы браліся, стараўся не адставаць ад яго. Ды ў асноўным усё адбывалася ўлетку. Хоць і ў іншыя поры года лынды не біў, па гаспадарцы дапамагаў. А школьнікам «захапіўся маляваннем, іграў у аматарскіх спектаклях, пісаў дэкарацыі <...>. Маленькая хата Бобрыкаў была своеасаблівым местачковым клубам».

Не чужой сталася яму і паэзія. Упершыню надрукаваўся ў 1924 годзе ў газеце «Беларускі піянер» («Бярозка»). Твор так і называўся — «Піянер». У тым жа годзе паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У наступным годзе верш «Успаміны» надрукаваў часопіс «Чырвоны сцяг» (№ 7), «***То зазвоняць сэрца майго струны…» — газета «Савецкая Беларусь» (15 лістапада). 1926 год — чарговыя публікацыі ў «Савецкай Беларусі», газеце «Чырвоная змена», у часопісе «Маладняк». І першая калектыўная кніжка «Пунсовае ранне», дзе ён прадстаўлены ў суседстве з гэтакімі, як і сам, маладымі аўтарамі Алесем Звонакам і Янкам Туміловічам.

Серыя «Кніжніца Маладняка», у якой яна выйшла, карысталася папулярнасцю па ўсёй краіне, а што ўжо казаць пра Янку Бобрыка. Землякі і так ужо ўспрымалі яго сваім паэтам. А яшчэ і майстрам на ўсе рукі. Сяргей Грахоўскі ўспамінаў: «Памятаю, як у Глуск прыслалі першую кінаперасоўку, з дынамкаю, якую звычайна круцілі самыя дужыя хлопцы. Ніхто доўга не мог разабрацца ў гэтай апаратуры. На канікулы прыехаў Янка, пакорпаўся і "пусціў" кіно. З воласці далі каня, і студэнт Бобрык усё лета ездзіў па сёлах і "круціў" адзін фільм».

Прывозіў ў мястэчка і кніжкі, выдадзеныя «Маладняком», даваў іх чытаць ахвотным. Калі такіх было шмат, арганізоўваліся калектыўныя чыткі. Асобныя вершы земляка завучвалі на памяць. Найперш тыя, у якіх паўставалі знаёмыя ім рэаліі. Так, у вершы «Бацьку» пазнаваўся Іван Бобрык-старэйшы. Бацьку «свайго» паэта ведалі не толькі як выдатнага каваля, але і як казачніка:

Ты любіў з натхненнем пад вячэрні свіст
Казку аб мінулым варушыць, як ліст.
Мы сядзім на печы, спахмурнеў лучнік,
За акном агеньчык замільгаў і знік.

Блізкай ім была і прырода, якую апяваў Янка Бобрык. У вершах прамаўлялася тое, што жыло і ў саміх у душы:

Люблю я восень на Палессі,
Прастор замоўк, а не застыў,
Укрыла шэрань стрэхі, вецце,
На верасах —
Лісты.
Лісты…
Люблю я раніцу увосень,
Бо раніцу люблю ў жыцці,
Праз кучаравасць стромкіх сосен
Да светлых
Плысці,
Плысці.

Закончыўшы ўніверсітэт, Янка Бобрык працаваў у Мілаславіцкай школе на Клімаўшчыне, выкладаў беларускую мову і літаратуру. Пісаў не толькі вершы. Напісаў і паэму «Галіна», галоўная гераіня якой, маладая настаўніца, жыла тымі ж клопамі, што і сам ён: «Аркестраў, музыкі не трэба, // Паслухай музыку ў жыцці…»

Вучобу прадоўжыў у Дзяржаўнай акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе. Закончыўшы яе, працаваў у гэтай установе, пасля — у студыі Белдзяржкіно — тады яна знаходзілася ў горадзе на Няве. Як даведаўся Сяргей Грахоўскі ад яго жонкі паэтэсы Наталлі Вішнеўская, «апошнія два гады перад вайной <…> шмат працаваў над нарысамі па гісторыі кіно, пісаў вершы».

Па стане здароўя быў зняты з ваеннага ўліку. Мог эвакуіравацца, але сапраўдны камуніст Янка Бобрык такога сабе не дазволіў. Стаўшы добраахвотнікам народнага апалчэння, капаў акопы, рабіў умацаванні. Даводзілася і за зброю брацца, адбіваючы атакі. А здароўе ўсё пагаршалася. Некалькі разоў упрошвалі ўсё ж пакінуць Ленінград, настойвала на гэтым і жонка. Адказ быў адзін: «Я нікуды не паеду. Паміраць, дык у Ленінградзе». У канцы ліпеня яго, знясіленага, падабралі на вуліцы санітары. Урачы ўратаваць не змаглі. 25 жніўня 1942 года памёр і быў пахаваны на Піскароўскіх могілках. Усе рукапісы і кнігі, што знаходзіліся ў кватэры, загінулі.

Наколькі цудоўным лірыкам быў Янка Бобрык, відаць па вершы «Ноч над Мінскам». Ён з яшчэ адным — «***Прывет табе з Палесся…», прысвечаным Уладзіміру Дубоўку, змешчаны ў другім томе «Анталогіі беларускай паэзія» (1993). Напісаны ў 1928 годзе, у Ленінградзе, а ўражанне такое, быццам сёння і ў Мінску. Асобныя яго допісы змешчаны і ў калектыўным зборніку «Мы іх не забудзем» (1949).

Уладзімір Рагуцкі.

Цёплае Чавускага павета Магілёўскай губерні, цяперашняга райцэнтра Магілёўшчыны. Закончыўшы пачатковую школу ў вёсцы Старое Пашкава, вучобу прадоўжыў у сярэдняй школе ў Магілёве, пасля ў 1930 годзе паступіў у Мінскі педагагічны інстытут.

Дэбютаваў вершам «У лагеры» («Піянер Беларусі», 1934, 6 жніўня). Два наступныя — «Наша клятва» і «Памяці Паўліка Марозава» — у гэтым выданні з'явіліся праз год. Па назвах іх відавочна, што напісаны ў духу свайго часу. Загана, канешне, не ў гэтым. Творчая моладзь, ды і аўтары больш сталага ўзросту, чуйна рэагавалі на тое, што адбывалася наўкола. Бяда, што часта нічога новага не прамаўлялася, а таму за агульнымі развагамі не прысутнічала ні каліва паэзіі.

Як паэт Уладзімір Рагуцкі сцвердзіў сябе вершам «Хвоя» ў часопісе «Полымя рэвалюцыі» (1938, № 10). У ім таксама павевы новага, матывы абуджэння, але ўсё гэта выказана настолькі шчыра, што настрой лірычнага героя адразу перадаецца чытачу. Дваццаціаднагадовы юнак у ім паўстае творцам, здатным убачыць, перадаць харство паэзіі там, дзе, здавалася б, усё звычайна, будзённа. Іншы прайшоў бы каля хвоі спакойна, а ён зірнуў на яе з замілаваннем, пяшчотай. Нібы і не дрэва, а дзяўчына, якой нельга не захапляцца:

Цябе любіць ранак золкі,
Любіць ясная зара;
Пасля дожджыку вясёлка
Абнімае, як сястра.

І, як вечарам паволі
Ахіне прастор імжа,
На тваім шырокім голлі
Зоры спелыя дрыжаць.

Стаіць хвоя бесклапотна «над глыбокаю ракой». У люстэрка ўзіраецца, расой умываецца. І раптам тое, што ніяк не адпавядае сказанаму дагэтуль: «Але заўтра, раніцою, // Ты павалішся на дол». Следам зусім неверагоднае сведчанне: «А як ты скоцішся з абрыву, // Я скажу: // — Шчаслівы пуць! // За табою над вадою // Мае мары паплывуць». Усё становіцца зразумелым, калі даведваешся, пра што марыцца лірычнаму герою:

«Нехта са старшакурснікаў, — працягвае Мікола Якаўлевіч, — пахваліўся, што гэты верш напісаў іх студэнт, і паказаў нам Рагуцкага, чарнявага хлопца з мілым дзявочым абліччам.

Праз нейкі месяц "Полымя рэвалюцыі" на адным развароце надрукавала побач яго і мой вершы. Мы былі імяніннікамі… Хтосьці тады і пазнаёміў мяне з Рагуцкім.

Як-ніяк ён быў усё-такі трэцякурснік, дый па ўзросце старэйшы за мяне на тры гады. Таму я звычайна неяк нясмела падыходзіў да яго на перапынках. А Уладзімір таксама быў сарамлівы і заўсёды ветлівы…»

З-за гэтай сарамлівасці не ад яго самога, а ад паэта Янкі Журбы даведаўся, што ён у пачатковай школе быў настаўнікам Уладзіміра Рагуцкага. Аднойчы Іван Якаўлевіч прынёс творы ў рэдакцыю газеты «Піянер Беларусі» (вучобу ў інстытуце Мікола Аўрамчык сумяшчаў з журналісцкай працай): «Пры размове з ім я ўспомніў пра Рагуцкага. Трэба было бачыць, як засвяціўся радасцю твар Журбы, як з гонарам ён сказаў тады:

— О, дык гэта ж мой вучань!.. Я цяпер уважліва сачу за яго вершамі…»

Закончыўшы інстытут, Уладзімір Рагуцкі працаваў у абласной газеце «Камунар Магілёўшчыны», актыўна займаўся і паэтычнай творчасцю. Вітаючы ўз'яднанне Беларусі, напісаў верш «17 верасня», які быў змешчаны ў часопісе «Полымя рэвалюцыі» (1940, № 9–10) і стаў адным з найлепшых у беларускай паэзіі на гэтую тэму. Здаў у Дзяржаўнае выдавецтва БССР рукапіс сваёй першай кнігі. На жаль, ён згарэў пры бамбёжцы Мінска. А Уладзімір Рагуцкі, прызваны ў Чырвоную Армію, загінуў у першых баях каля заходняй мяжы.

У апошні год вучобы ў інстытуце ён падарыў Міколу Якаўлевічу свой здымак і некалькі вершаў. Яны таксама не зберагліся, а са здымка зроблены партрэт Уладзіміра Рагуцкага, які і даносіць да нас яго воблік.

* * *

Свае згадкі Мікола Аўрамчык невыпадкова назваў «Паэт і чайка». Пасля таго, як Уладзімір Рагуцкі скончыў універсітэт, ён больш з ім не сустракаўся: «Помню толькі, што ўлетку 1940 года ў "Літаратуры і мастацтве" прачытаў два яго вершы. Адзін з іх, пра чайку, заканчваўся радкамі:

Чайка мора дужае абудзіла,
А сама загінула ў імгле, —
Каб зрабіцца хваляй белакрылай
І спачыць на каменнай скале.

Як і гэтая чайка, сам паэт загінуў у "імгле вайны"». І Янка Бобрык таксама. Па-свойму сімвалічна, што ўспаміны пра іх — Сяргея Грахоўскага «Кветкі і вечны агонь» і Міколы Аўрамчыка «Паэт і чайка» — стаяць амаль па суседстве ў зборніку «Дзень паэзіі. 1971», дзе апублікаваны. Прысутнасць гэтых паэтаў, як і іншых, пра каго пісалася раней у рубрыцы «Год гістарычнай памяці», адчуваецца ў курлыканні журавоў, што пад восень, адлятаючы ў вырай, нагадваюць аб сабе. А ці няма іх прысутнасці і ў крыку чаек, якія нібы прамаўляюць: беражыце мір. Беражыце і нас памятайце.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

На сувязі — Удмурція

Газета «Літаратура і мастацтва» традыцыйна ўважліва ставілася да развіцця беларуска-ўдмурцкіх літаратурных сувязей. Сярод нашых аўтараў — народны пісьменнік Удмурцкай Рэспублікі Вячаслаў Ар-Сяргі. Таму і не выпадкова, што мы звярнулі ўвагу на наступную падзею.

У Апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей прайшла рабочая сустрэча па стварэнні ў Беларусі ўдмурцкага зямляцтва. Падзея супала з візітам кіраўніка Удмурцкай Рэспублікі Аляксандра Брачалава ў Рэспубліку Беларусь. Рэй у сустрэчы вялі намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Беларусі Алена Радчанка і міністр нацыянальнай палітыкі Удмурцкай Рэспублікі Эдуард Пятроў. Эдуард Сцяпанавіч звярнуў асаблівую ўвагу на дзейнасць Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Таварыства беларускай культуры ва Удмурцкай Рэспубліцы "Бацькаўшчына"».

Болей падрабязна пра жыццё нашых суайчыннікаў ва Удмурціі расказаў старшыня «Бацькаўшчыны» Мікалай Украінец. Ён, у прыватнасці, зазначыў, што ў рэспубліцы пражывае 2313 беларусаў. Дарэчы, да жыццядзейнасці беларускага таварыства прыцягваюцца і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, каму цікавая беларуская нацыянальная культура, хто з асаблівым захапленнем звяртаецца да вывучэння гісторыі Беларусі. Удмурцкія беларусы ладзяць многія мерапрыемствы культурна-асветніцкага характару. У Іжэўску і Воткінску нават у дзіцячых садках ёсць беларускія групы. Беларускія мастацкія калектывы створаны і ў музычных школах. Дзеці вывучаюць беларускі фальклор, старэйшыя вучні пішуць даследаванні па фальклоры, этнаграфіі беларусаў. Мікалай Дзмітрыевіч — член Саюза пісьменнікаў Расіі, ганаровы будаўнік Расіі, заслужаны будаўнік Удмурцкай Рэспублікі, ганаровы грамадзянін горада Іжэўска, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Удмурцкай Рэспублікі, заслужаны работнік дзяржаўнай і муніцыпальнай службы Удмурцкай Рэспублікі. Нарадзіўся Мікалай Украінец на Берасцейшчыне, у Столінскім раёне, часта бывае ў Беларусі. Як пісьменнік даследуе повязі Беларусі і Удмурціі, піша пра ваенную гісторыю Берасцейшчыны.

Гісторык Юрый Бажэнаў расказаў пра даўнія памкненні ўдмуртаў Беларусі стварыць зямляцтва. Ён звярнуў увагу на тое, што многія з удмуртаў ваявалі ў Беларусі, абаранялі і вызвалялі рэспубліку ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яркі прыклад — удмурцкі паэт, празаік, камандзір стралковай роты Піліп Кедраў, які загінуў на Віцебшчыне і пасмяротна

Міністр нацыянальнай палітыкі Удмурцкай Рэспублікі Эдуард Пятроў.

ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. У 1999 годзе ў Іжэўску выйшла кніга П. Кедрава «Песня не памрэ» — на ўдмурцкай і рускай мовах. У Смалявічах, на Міншчыне, загінула снайпер і тэлефаністка Герой Савецкага Саюза (высокім званнем адзначана пасмяротна) Таццяна Барамзіна. 1 ліпеня 1988 года Пекалінскай СШ Смалявіцкага раёна пастановай беларускага ўрада было прысвоена імя Таццяны Барамзіной.

Пра беларуска-ўдмурцкія літаратурныя і культурныя сувязі на сустрэчы распавёў дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч: «На тэрыторыі Беларусі ваяваў народны пісьменнік Удмурціі Міхаіл Лямін. Пра Віцебшчыну перыяду Вялікай Айчыннай вайны ён расказаў у сваёй кнізе "Чатыры гады ў шынялі". Гасцяваў на Міншчыне, у гераічным Барысаве, на Чэрвеньшчыне і Пухавічыне ўдмурцкі паэт, празаік, перакладчык Вячаслаў Ар-Сяргі. У серыі "Сябрына: паэзія народаў Расіі" на беларускай мове пабачыла свет яго кніга "Ранішні вецер у акне". Перакладчыкам вершаў удмурцкага паэта выступіў таленавіты беларускі перакладчык Віктар Гардзей…» Ішла размова на сустрэчы і пра неабходнасць заключэння дагавора аб супрацоўніцтве паміж пісьменніцкімі арганізацыямі Беларусі і Удмурцкай Рэспублікі. Варта было б, відаць, улічваючы такі аўтарытэт беларускай «Бацькаўшчыны» ў Іжэўску, правесці Дні беларускай літаратуры ва Удмурціі… Такая практыка сустрэч беларускіх пісьменнікаў з чытачамі расійскіх рэгіёнаў была традыцыйнай у XX стагоддзі. Вярнуцца да гэтага — агульны і важны клопат і Міністэрства культуры краіны, і Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Удзел у рабочай сустрэчы ўзялі і мастацкі кіраўнік «Гродзенскай капэлы», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Борматаў, ваенны лётчык, пенсіянер Алег Главацкіх, ураджэнец Удмурціі, які зараз жыве ў Гомелі, педагог Міхаіл Возісаў, загадчык сектара па справах нацыянальнасцей Апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Алена Бязручка. Суразмоўцы падзяліліся сваімі меркаваннямі наконт ідэі стварэння ўдмурцкага зямляцтва ў Беларусі. Між іншым, па выніках перапісу 2019 года ў нашай краіне пражывае 246 удмуртаў. Больш за ўсё — на Гомельшчыне — 56 чалавек. Пытанне будзе і надалей прапрацоўвацца.

Важна падтрымаць на фоне гэтай ініцыятывы перакладчыцкія стасункі паміж пісьменнікамі Беларусі і Удмурціі. У «ЛіМе», акрамя В. Ар-Сяргі, друкаваліся і іншыя аўтары. Чаму б падборку маладой удмурцкай паэзіі не даць у перакладзе на беларускую мову ў часопісе «Маладосць»? Варта прыгледзецца і да іншых падобных праектаў.

Кастусь ЛЕШНІЦА
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

Творчыя ініцыятывы ў межах Саюзнай дзяржавы

«Зямля — наш агульны дом» — унікальны беларуска-рускі праект — завяршыўся выданнем двух тамоў анталогіі сучаснай сусветнай паэзіі, прэзентаваных у лістападзе беларускаму чытачу ў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэцы імя У. І. Леніна.

Развіццё міжнародных творчых кантактаў і ўзаемадзеянне ўсёй пісьменніцкай супольнасці Беларусі і Расіі, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці — адзін з важных кампанентаў у рабоце Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, Саюзаў пісьменнікаў Беларусі і Расіі. Яркія прыклады гэтай дзейнасці — у працы Гомельскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» і партнёраў аддзялення — рэгіянальных грамадскіх творчых арганізацый і мясцовых беларускіх нацыянальна-культурных аўтаномій Расійскай Федэрацыі.

У бягучым месяцы завершаны чарговы міжнародны праект «Зямля — наш агульны дом», у рэалізацыі якога бралі ўдзел беларускія і рускія пісьменнікі.

Адкрываючы міжнародную прэзентацыю, старшыня абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Уладзімір Гаўрыловіч падкрэсліў, што «Зямля — наш агульны дом» — сапраўды незвычайны беларуска-рускі праект, які падводзіць вынікі 10-гадовага супрацоўніцтва гомельскіх і растоўска-краснадарскіх літаратараў:

— У межах плённага супрацоўніцтва пісьменнікаў Гомельшчыны з літаратарамі Расіі ў рамках міжнародных фестываляў-пабрацімаў «Славянскія літаратурныя Дажынкі» (Гомель) і «Берагі дружбы» (Растоўская вобласць) выдадзена больш за 70 зборнікаў паэтычных перакладаў, з іх 10 кніг на беларускай мове. Толькі дзякуючы шматгадоваму ўдзелу ў міжнародных сумесных перакладчыцкіх праектах у нашым абласным аддзяленні больш за два дзясяткі літаратараў дасягнулі ўзроўню прафесійных перакладчыкаў, развіваюцца і школы перакладу сярод паэтаў у Гродне, Магілёве, да працэсу ўсё больш актыўна далучаюцца літаратары Брэста, Мінска і Віцебска.

У бягучым годзе гамяльчане разам з расійскімі партнёрамі — актывам Міжнароднага фестывалю «Берагі дружбы» — пайшлі далей за традыцыйныя конкурсныя заданні: вырашылі ажыццявіць паэтычныя пераклады твораў як вядомых аўтараў, так і пачаткоўцаў з усяго свету на рускую і беларускую мовы. Так перакладчыкі адрэагавалі на прапанову аб супрацоўніцтве з боку міжнароднага літаратурнага руху «Свет без сцен» (прадстаўніком яго ў Расіі з'яўляецца вядомы рускі паэт Вадзім Цярохін, пастаянны ўдзельнік і актыўны прапагандыст гомельскага і растоўскага літаратурных фестываляў).

У ліпені 2022 года выйшаў першы том анталогіі сучаснай сусветнай паэзіі «Зямля — наш агульны дом» (прадмовы: В. Дварцоў, В. Цярохін; кіраўнікі праекта: У. Гаўрыловіч, Л. Север; 450 ст.). Першыя прэзентацыі анталогіі на рускай мове адбыліся 29 ліпеня ў рамках Міжнароднага фестывалю-конкурсу «Берагі дружбы» ў Данской дзяржаўнай публічнай бібліятэцы ў Растове-на-Доне і 1 верасня 2022 года ў рамках Міжнароднага фестывалю-свята «Славянскія літаратурныя Дажынкі» ў Гомелі, у абласной універсальнай бібліятэцы імя У. І. Леніна.

Тым часам 22 гомельскія перакладчыкі, а таксама 6 запрошаных з Гродна і Магілёва са снежня 2021 да верасня 2022 года напружана працавалі над перакладамі твораў 46 аўтараў з 26 краін свету на беларускую мову. І ў пачатку лістапада кніга «Зямля — наш агульны дом. Анталогія сучаснай сусветнай паэзіі» (прадмовы: М. Чаргінец, У. Гаўрыловіч; кіраўнікі праекта: У. Гаўрыловіч, Л. Север; 446 ст.) выдадзены Гомельскім абласным аддзяленнем ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі».

У рамках творчых праграм і праектаў Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы ў актавай зале Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі 15 лістапада адбылася міжнародная прэзентацыя другой кнігі, прысвечаная завяршэнню

беларуска-рускага выдавецкага праекта «Зямля — наш агульны дом».

У пачатку мерапрыемства, у якім узялі ўдзел пісьменніцкі актыў рэгіёна, прадстаўнікі ўлады, сістэмы адукацыі і культуры, расійскага Цэнтра навукі і культуры, згадвалі сапраўднага сябра Гомельшчыны і Беларусі Уладзіміра Сарочкіна. Са сцэны прагучалі паэтычныя радкі, гледачы паглядзелі ўрывак з дакументальнага фільма пра жыццёвы і творчы шлях і ўшанавалі хвілінай маўчання памяць культурнага і грамадскага дзеяча Браншчыны, выдатнага рускага паэта, перакладчыка, арганізатара і ўдзельніка многіх беларуска-расійскіх літаратурных праектаў. Прайшоў роўна год з дня заўчаснай смерці таленавітага пісьменніка.

Са словамі прывітання і падзякі да ўдзельнікаў міжнароднай ініцыятывы анлайн звярнуўся старшыня праўлення ГА МНКА «Беларусы Няклінаўскага раёна», член Вышэйшага творчага савета Саюза пісьменнікаў Расіі, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Леанід Север. Леанід Юр'евіч падкрэсліў значнасць і ўнікальнасць ажыццёўленага праекта, паведаміў пра старт прыёму конкурсных заявак ад моладзі і паэтаў-прафесіяналаў дзвюх краін на «Берагі дружбы-2023» і запрасіў прафесійных паэтаў-гамяльчан у наступным годзе паўдзельнічаць у праекце па перакладзе твораў вядомых паэтаў малых народаў Расіі.

Кранальна са сцэны гучалі пераклады на беларускую мову твораў пісьменнікаў з розных краін у выкананні перакладчыкаў Міхася Болсуна, Ніны Шкляравай, Тамары Кручэнкі, Дар'і Дарошкі, Алега Ананьева, Мікалая Ждановіча, Святаслава Крупенькі, Іны Зарэцкай, маладой паэткі Аліны Рыцік і многіх іншых.

Прадстаўнік расійскага Цэнтра навукі і культуры Маргарыта Савельева ўручыла падзяку Рускага Дома ў Гомелі Уладзіміру Гаўрыловічу за вялікі асабісты ўклад у справу яднання брацкіх народаў.

Прэзентацыя завяршылася ўручэннем падарункаў — новых кніг і выданняў для папаўнення фондаў абласной бібліятэкі і цэнтральнай гарадской бібліятэкі Гомеля.

Мікалай ІГНАТОВІЧ

Колер = вобраз

Выстаўка «Альгерд Малішэўскі. Рэтраспекцыя» ў Нацыянальным мастацкім музеі павінна была працаваць яшчэ некалькі дзён, аднак у пачатку тыдня арганізатары паведамілі, што па тэхнічных прычынах яна закрываецца ў сераду. Час нагадаць, якімі былі адметнасці гэтай выстаўкі, чым яна запомніцца тым, хто паспеў яе наведаць, і як адрознівалася ад праекта «Альгерд Малішэўскі. Эпоха», які праходзіў летам у Палацы мастацтва.

Сёлета адзначаецца 100-годдзе знакамітага мастака і педагога. Альгерд Малішэўскі (1922—1989) — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Прафесійную адукацыю атрымаў у Харкаўскім дзяржаўным мастацкім інстытуце. Вучыўся ў вядомых мастакоў, сярод якіх былі Пётр Котаў і Дзмітрый Шавыкін. Адразу пасля заканчэння, у 1952 годзе, вярнуўся ў Беларусь. Выкладаў у Мінскім мастацкім вучылішчы імя А. Глебава ў перыяд з 1953-га да 1981-га. У 1956 годзе ўступіў у Саюз мастакоў БССР. Працаваў ва ўсіх жанрах станковага жывапісу, аднак сюжэтна-тэматычная карціна стала для яго адной з галоўных крыніц натхнення, як і для многіх жывапісцаў таго перыяду.

На жаль, вельмі часта Альгерда Малішэўскага згадваюць толькі як выключнага настаўніка, які дапамагаў таленавітым студэнтам тым, чым мог і лічыў неабходным. Так, самі арганізатары ўспамінаюць гісторыю, звязаную з падтрымкай Альгердам Малішэўскім забароненай выстаўкі 1985 года «1+1+1+1+1+1+1=6» у Доме літаратара (загадкавы, дарэчы, праект, адзін з многіх, пра якія сёння можна даведацца толькі з вуснаў відавочцаў). Педагог значыцца і сярод тых, хто з энтузіязмам успрыняў ідэю стварэння мастацкага аб'яднання «Няміга-17», а таксама паспеў паўдзельнічаць у адной з выставак гэтай суполкі. Тады, у 1988 годзе, у Палацы прафсаюзаў ён прадставіў дваццаць карцін. Дарэчы, нядаўняя выстаўка ў Палацы мастацтва была прысвечана ў асноўным Малішэўскаму-педагогу. Тое, колькі непадобных студэнтаў ён апекаваў і якім чынам на іх уплываў, і стала сюжэтам «Эпохі», што задумвалася як спроба адлюстравання часу і самых розных яго павеваў.

У Нацыянальным мастацкім музеі прадставілі толькі аўтарскія работы (карціны з фондаў НММ, Беларускага саюза мастакоў і работы з сям'і мастака), надаючы ўвагу асаблівасцям розных перыядаў у творчасці. Так, раннім сюжэтам 1950—1960-х гадоў уласціва пленэрнасць. Для работ 1970-х — пачатку 1980-х гадоў характэрна дбайная прапрацоўка вобразаў людзей розных прафесій. У нешматлікіх творах, прысвечаных тэме вайны, аўтар звяртаўся да вобраза маці. Між тым у 1980-х гадах мастак адышоў ад фігуратыўнага жывапісу і часта эксперыментаваў з абстрактнымі формамі.

«Вясна», 1962 г.

Вельмі важнай для яго была гармонія. Альгерд Малішэўскі не канцэнтраваўся на колеры і цені, сюжэце і кампазіцыі, фактуры і метадзе паасобку. Аднак адна з асноўных характарыстык, якімі мастацтвазнаўцы і аматары жывапісу апісвалі і апісваюць творцу, — выдатны каларыст (згодна з меркаваннем самога мастака, «колер» роўна «вобраз»). Гэтая якасць была відавочнай і пасля прагляду выстаўкі ў Мастацкім. Цэнтральным творам экспазіцыі стала «Вясна» 1962 года, багатая на колеры. Галоўныя — блакітны, чырвоны, жоўты і салатавы. Захавана неабходная для такіх кампазіцый вытрыманасць, выбранае спалучэнне не канфліктуе з пераважна спакойным фонам, таму і вобразы ўразаюцца ў памяць. Хаця, здавалася б, нічым адметным яны не вылучаюцца: звычайныя працаўніцы адпачываюць пакуль яшчэ не спякотным днём. Цікавае не толькі колеравае рашэнне, але і пабудова кампазіцыі: неба, як падавалася, абавязковае для твораў такога тыпу, тут абмінаецца. Яго ў пэўным сэнсе замяняе пераворваная зямля — метафара цяжкага лёсу вясковага чалавека і яго роднасці з прыродай.

Выразная асаблівасць герояў Альгерда Малішэўскага — натхнёнасць. Ці то будаўнікі, ці то калгаснікі, ці то ўрачы, ці то дзеячы мастацтва — да кожнага з іх аўтар ставіўся з вялікай увагай.

«Аўтапартрэт», 1964 г.

Між тым у гэтых вобразах існуе нешта агульнае — відаць, што ён імкнуўся не толькі надаць характэрныя і індывідуальныя рысы тым, хто яму пазіраваў, але і стварыць абагульненыя вобразы. Многія параўноўваюць адлюстраваных людзей з пакутнікамі, нехта можа ўбачыць у іх вернікаў, а іншыя — звычайных працаўнікоў, захопленых роднай зямлёй і яе народам. Дарэчы, у партрэтнай галерэі Альгерда Малішэўскага вылучаюцца дактары (у свой час яны выратавалі мастака) — велічныя, спакойныя, натуральна, суровыя. Творца ставіўся да ўрачоў з вялікай павагай, нібыта бачыў у іх усемагутных жрацоў.

Адна з ключавых работ на мінулай выстаўцы, якая адлюстроўвае творчыя пошукі Альгерда Малішэўскага, — «Маці партызанская» (1968), прасякнутая трагізмам і болем. Кажуць, мастак не любіў расказваць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны і ўсё ж не мог не прысвяціць ім некалькі асаблівых работ. Зноў-такі, «Маці партызанская» ўражвае не столькі сюжэтам, вобразамі, сімволікай, колькі колерам, які пакідае гледача ў стане збянтэжанасці і разгубленасці. Чаму, як, навошта?.. Адказы на гэтыя пытанні даволі лёгка дае навука мастацтвазнаўства, але зварот да яе ў некаторых выпадках можа падацца празмерна простым шляхам.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Імкненне да размаху

Да 70-годдзя беларускага жывапісца Мікалая Бандарчука Нацыянальны мастацкі музей прымеркаваў выстаўку «Дыялог з часам». Змест экспазіцыі склалі пераважна пейзажы, прысвечаныя харству Беларусі. Сярод твораў — лірычныя пейзажы і ваенна-патрыятычныя работы розных перыядаў творчасці.

Мікалай Бандарчук нарадзіўся ў вёсцы Сярэднія Печы Гомельскай вобласці. Выхоўваўся ў вялікай творчай сям'і, дзе ўсе любілі музыку ды іграліся на розных інструментах. У 1971 годзе скончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве, а ў 1976-м выпусціўся з Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (вучыўся на аддзяленні манументальна-дэкаратыўнага мастацтва). З 1985 года — член Саюза мастакоў БССР. Працуе ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і станковага жывапісу. Творца з'яўляецца старшынёй Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза мастакоў, а таксама выкладае ў Гродзенскім каледжы мастацтваў. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, медалём Беларускага саюза мастакоў «За заслугі ў выяўленчым мастацтве». У 2020 годзе яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь».

«Каложа», 1989 г.

Ваенна-патрыятычныя работы займаюць асобнае месца ў творчасці Мікалая Бандарчука, але на выстаўцы змешчаны толькі некалькі з іх. Гэта, напрыклад, «Крах» (1985) — упэўненае і бескампраміснае выказванне. Мастацкая вартасць карціны — лаканізм, аднак, падаецца, толькі яго недастаткова для раскрыцця такой задумы.

Найбольш поўна талент Мікалая Бандарчука выяўляецца ў пейзажах, якія выпраменьваюць цяпло і святло. Мастак удала абыгрывае белы колер, які стаў асноўным у яго краявідах і не толькі. Яснасць, з якой ён падыходзіць да канцэпцыі твора, выяўляецца і ў сюжэтах. Дарэчы, сам жывапісец называе свой стыль асацыятыўным рэалізмам. Такім чынам ён аб'ядноўвае цікавасць да эпічнага і лірычнага пейзажа. Між іншым, відавочная сувязь жывапісу Мікалая Бандарчука і Леаніда Шчамялёва, які, дарэчы, выкладаў у аўтара «Дыялогу з часам». Тое ж імкненне да размаху, тая ж любоў да прыроды, асабліва да зімніх пейзажаў, тыя ж сардэчнасць і ўсхваляванасць… У гэтым рэчышчы згадваюцца найперш такія карціны выстаўкі, як «Каложа» (1989), «Каўказскі матыў» (1987), «Апакаліпсіс» (2004) і «Плывуць аблокі» (1987).

«Каўказскі матыў», 1987 г.

Але што ж складае дыялог Мікалая Бандарчука з часам? Чаму аўтар амаль не закранае пытанняў і праблем, якія маглі б паспрыяць змястоўнай размове на гэтую тэму і зачапіць тыя ці іншыя балючыя кропкі? Верагодна, тут усё залежыць ад таго, што творца ўкладвае ў паняцце часу і якімі катэгорыямі разважае ў дачыненні да мінулага, сённяшняга і будучага. Жывапісец у гэтым выпадку выглядае хутчэй як сузіральнік, схільны да ўнутраных разваг аб пастаянстве і нязменнасці, мысліцель, маўклівасць якога толькі на руку аматару мастацтва.

Выстаўка «Дыялог з часам» будзе працаваць да 19 снежня.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Палёты над Палессем

Стужкапіс — новы кірунак у галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Стваральніцай творчага метаду стала мастачка і ілюстратарка Анастасія Балыш. Асноўны прадмет, які выкарыстоўваецца пры стварэнні арт-аб'екта, як зыходзіць з назвы, — каляровая атласная стужка.

Падарожжа

— Маляванне стужкамі стала для мяне адкрыццём, — распавядае сама Анастасія. — Звычайна малюю фарбамі, змешваю колеры на палітры, а я змешваю стракатыя колеры стужак.

Ідэя стварэння незвычайнай выявы з'явілася ў мастачкі пасля экспедыцыі на Палессе. Паўднёвы рэгіён Беларусі адметны наяўнасцю вялікага шэрагу аздабленняў абжытага асяроддзя. У тым ліку мясцовыя жыхары выкарыстоўваюць і пярэстыя стужкі для ўпрыгожвання.

На свята Тройцы разам з даследчыцай жыцця праваслаўных новапакутнікаў Беларусі краязнаўцай Таццянай Хамянковай і майстрыхай саломапляцення Аленай Грынь Анастасія ездзіла па мясцінах служэння беларускага святога, новапакутніка Парфірыя Заслаўскага. У наступным годзе жыхары Заслаўя, дзе жыве мастачка, будуць адзначаць 140-годдзе заступніка горада.

Адзін з кірункаў дзейнасці Анастасіі Балыш — роспіс ікон для праваслаўных храмаў. У мінулым годзе мастачка разам з Аленай Грынь выканалі работу па ўшанаванні памяці Парфірыя Заслаўскага. Быў намаляваны абраз новапакутніка, а з саломы створаны аклад да выявы — каб падкрэсліць беларускае паходжанне святога.

— Па дарозе ў вёску Лемяшэвічы, дзе нарадзіўся Парфірый Заслаўскі, — дзеліцца ўспамінамі мастачка, — мы наведалі самыя розныя мясціны. І паўсюль мяне ўражвала колькасць яскравых, амаль кіслотных стужак. Ва ўрочышчы Ізбійскі Бор, на Ганцаўшчыне, усё ахутана таямніцамі. Легенда апавядае, што калісьці там расла сасна, якую спілавалі, пакінуўшы толькі метры чатыры. На зрэзе дрэва ўбачылі выяву Багародзіцы з дзіцем. Побач пабудавалі храм, дзе і захоўваюць спіл з вобразам.

Ужо каля стагоддзя людзі прыязджаюць у гэтае святое месца і на слупе, які застаўся ад сасны, пакідаюць стужкі, ды звяртаюцца з просьбай ці малітвай да Багародзіцы. Рэшткі сасны ў некалькі слаёў абвязаны стужкамі, якія прывезлі з сабой вернікі. Акрамя таго, прывозяць туды людзі і ручнікі, і тканіны, і абразкі. Анастасія Балыш жартуе, што каля гэтай сасны сабралася ўся культурная спадчына Палесся.

Кожны чалавек прыязджае ў гэтае месца са сваёй марай ці бядой, пакідаючы энергію і сілу, а больш за ўсё надзею на тое, што жаданне спраўдзіцца. Ад таго нават дрэвы навокал аздабляюцца стужкамі і каштоўнымі тканінамі тых, хто моліцца і просіць.

Мясцовыя святары ставяцца да незвычайнага месца дастаткова спакойна. На іх думку, калі чалавек верыць толькі ў стужачку, то гэта паганства. А калі вернік звяртаецца па дапамогу да Багародзіцы і нябесных заступнікаў, а стужка — толькі нейкі энергетычны канал, то на гэта можна глядзець як на хрысціянства.

Анастасія Балыш каля работы «Апошняя хваля Прыпяці», 2022 г.

Нават могілкі мясцовыя жахары ўпрыгожваюць стужкамі. Для насельніцтва гэта звыклы рытуал. Такое аздабленне прысутнічае на магілах і ў святочныя дні, і ў звычайныя. Колер стужкі значэння не мае. Яркія барвовыя атласныя адрэзкі тканіны можна сустрэць на магільных крыжах, на галаўных уборах, у царкве, на святочных букетах і абразах святых.

Як бачыць мастак

— Не магла перастаць фатаграфаваць і захапляцца тым, што ўбачыла на Палессі. Вярнулася дадому ў Заслаўе, але гэтая гісторыя і экспедыцыя надоўга засталіся ў маёй памяці. Уражанні былі настолькі моцныя, што праз нейкі час я сама звярнулася да стужак і працы з імі, — адзначае Анастасія Балыш. — Можна сказаць, склалася містычныя гісторыя. Мой сусед-паляшук якраз у тыя часы мяняў агароджу. Драўляны разны плот збіраліся выкінуць, але я забрала яго і зрабіла асновай для свайго твора ў новай тэхніцы.

«Краса Палесся» стала першай работай мастачкі ў стужкапісе. Арт-аб'ект уяўляе сабой складзеныя пэўным чынам тонкія драўляныя дошкі, якія абвязаны чырвонымі, пурпуровымі, аранжавымі і ружовымі стужкамі. Разам яны складаюцца ў традыцыйны беларускі арнамент — «краса», што і дало назву твору. Выкарыстанне розных адценняў чырвонага на фоне сінявата-шэрага дрэва стварае заўважны кантраст, абуджае глыбінныя пачуцці, адлюстраваныя праз атласны адрэзак. У колеравай гаме з пэўнай адлегласці губляецца мяжа паміж стужкай і дрэвам, ствараючы жывапісную выяву.

Назва тэхнікі прыйшла не адразу, амаль выпадкова. «Краса Палесся» дэманстравалася на V Трыенале дэкаратыўнага мастацтва «ДЭКАРТ-22». Жадаючы акрэсліць новы спосаб мастацкага ўвасаблення, Анастасія Балыш і выкарыстала слова «стужкапіс».

Для работы ў дадзенай тэхніцы падыходзяць звычайныя атласныя стужкі, якія сёння можна набыць у любой краме тканін. Пытанні могуць узнікнуць толькі наконт колеру — тут усё залежыць ад мастацкай задумы. Аўтарка не сшывае, не склейвае стужкі, а завязвае, ствараючы такім чынам патрэбны эфект. Гэтым падкрэсліваецца аўтэнтычнасць, бо на Палессі адрэзкі тканіны таксама прывязваюцца да аб'ектаў.

Абрад альбо рытуал

Арт-аб'ект «Развітанне з буслом» навеяны надыходам восеньскай пары. Замест дрэва быў выкарыстаны дрот, які стаў асновай для стужак.

— Кожны свой твор я імкнуся пражыць. З другой работай адбылася дзіўная гісторыя. Арт-аб'ект атрымаўся падобным да шырокіх крылаў бусла, — успамінае стваральніца тэхнікі. — У выніку з'явілася відэа, дзе я апранула гэтыя замацаваныя стужкі і нават лётала. Нескладана было дарабіць у фоташопе, як цела падымаецца над зямлёй. Незвычайныя ўражанні ад судакранання з творам. Дзякуючы лёгкасці тканіны адчуваеш, як гуляе вецер, які ў яго напрамак, якая хуткасць. Збоку ўсё выглядае грацыёзна і вытанчана. У пэўныя імгненні сапраўды можна ўявіць палёт.

Відэа з арт-аб'ектам мастачка выклала ў «Фэйсбук». Унікальнасць тэхнікі і незвычайнае выкарыстанне ўласнай работы прымусілі прыхільнікаў творчасці Анастасіі Балыш палічыць, што з Палесся яна прывезла дагэтуль невядомы старажытны абрад. Давялося тлумачыць людзям, што гэта толькі мастацкая прыдумка.

Новая работа ў тэхніцы стужкапісу — гэта арт-аб'ект «Апошняя хваля Прыпяці» — вялікая 4-метровая хваля, выкананая з дапамогай блакітных і сініх стужак, якія ў спалучэнні ствараюць пераліў і насычанасць рачной хвалі і цёмных вод Прыпяці.

Яна ЦЭГЛА

Фотаалхімія

Сімбіёз тэхнікі XIX стагоддзя і нейрасетак можна пабачыць у галерэі Беларускага саюза дызайнераў. Выстаўка альтэрнатыўнай фатаграфіі «З лічбы ў жывапіс» распачалася 11 лістапада.

Сумесная праца шасці беларускіх фатографаў Дзмітрыя Кульпановіча, Ігара Калашнікава, Анатоля Дрыбаса, Віктара Ведзеня, Віталя Ціхамірава і Андрэя Кабанава дэманструе майстэрства гуміярабікавага фотадруку.

У экспазіцыі прадстаўлены фатаграфіі розных жанраў: пейзаж, нацюрморт, партрэт, стрыт і графіка. Для калектыву фатографаў выстаўка — вынік працы апошніх трох гадоў. Наведвальнікі маюць магчымасць убачыць каля 30 работ, створаных у тым ліку адмыслова для выстаўкі.

Арганізатары абяцаюць правядзенне майстар-класаў для тых, хто жадае атрымаць уласны досвед у стварэнні незвычайных фотаздымкаў.

Аб невядомай і складанай тэхніцы гуміярабікавага фотадруку распавёў адзін са стваральнікаў выстаўкі фатограф Ігар Калашнікаў:

— Для пачатку на камп'ютары апрацоўваецца фотаздымак. Ён можа быць зроблены і на лічбавы фотаапарат, і на плёнку. Выбраць здымак — асобная гісторыя. Ніколі не здагадаешся, які атрымаецца, а які давядзецца забракаваць.

З дапамогай праграм фатаграфію неабходна перавесці ў графіку. Пасля апрацаваны здымак раздрукоўваецца на спецыяльную фотаплёнку. Яна робіцца асновай таго, што потым пераносіцца на адмысловы аркуш. Плёнку можна выкарыстаць шмат разоў, але вынік на кардоне кожны раз будзе новы, мець адрозненні. Справа ў тым, што на вялікі аркуш наносіцца святлоадчувальная эсэнцыя, якая асобным слоем пакрывае аснову і дапамагае стварыць унікальны эфект.

Перанесены на аркуш фотаздымак засвятляецца ўльтрафіялетавай лямпай. Калі прыбіюць плёнку, атрымліваецца аранжавы малюнак. Справа ў тым, што ўльтрафіялет, трапіўшы на аркуш, робіць святлоўспрымальны слой разам з фарбай задубелым. Кардон у белых кавалках робіцца цалкам цвёрдым і фарбу не ўбірае, а ў цёмных кавалках — наадварот.

Падчас змыцця засохлая фарба вымываецца з белых кавалкаў, а на чорных застаецца. Так і атрымліваецца малюнак, выкананы ў дадзенай тэхніцы.

Здымкі, аддрукаваныя гумбіхроматным спосабам, больш дўгавечныя за выраблены метадам пігментнага фотадруку, паколькі схільны да старэння і грыбковага заражэння жэлацін выкарыстоўваецца толькі для праклейвання папяровай асновы.

Работы з гуміярабіку выглядаюць аднародна, нельга западозрыць, што дагэтуль адбыліся такія складаныя працэсы. Пры гэтым яны захоўваюць вытанчанасць, рэзкасць і кантраст фотаздымка.

Адзіны недахоп тэхнікі, на думку аўтараў, — непрадказальнасць вынікаў. Не па плане ўсё можа пайсці на любой стадыі стварэння, і да гэтага варта быць гатовымі

Ігар Калашнікаў «Старажытны Менск», 2022 г.

Дзмітрый Кульпановіч «Погляд у будучыню», 2022 г.

заўсёды. Нават тэмпература ў пакоі мае ўплыў на выгляд работы і насычанасць колеру. Сам працэс можа цягнуцца некалькі дзён.

Фатографы пазнаёміліся ў народым фотаклубе «Мінск» — самым старым аб'яднанні фатографаў у гісторыі Беларусі, створаным у 1960 годзе. Першым працаваць з такім спосабам стварэння фота стаў Дзмітрый Кульпановіч. Унікальнай тэхнікай у нашай краіне валодаюць толькі шэсць чалавек, а ў свеце гэтая лічба дасягае пятнаццаці.

Дэбютная сумесная выстаўка работ у тэхніцы гуміярабікавага фотадруку пад назвай «Гумоіл» адбылася ў сакавіку гэтага года ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Наведвальнікі маглі пазнаёміцца з сарака дзвюма работамі майстроў. Улетку выстаўка адбылася ў Гродне. Жыхарам горада дэманстраваліся ўнікальныя творы.

— Па-першае, гэтым вельмі цікава займацца. — падкрэслівае Ігар Калашнікаў. — Па-другое, тэхніка цалкам унікальная, і ты яе пакідаеш пасля сябе ў гісторыі, у фотамастацтве Беларусі.

Выстаўка «З лічбы ў жывапіс» працуе да канца года.

Яна ЦЭГЛА

Старонкі літаратурнага сяброўства

Ведаючы пра тое, што з Узбекістанам, узбекскай літаратурай з беларускіх пісьменнікаў найперш звязаны імёны Якуба Коласа, Эдзі Агняцвет, Сцяпана Ліхадзіеўскага, Аркадзя Мардвілкі, мы неяк губляем астатнюю інфармацыю аб прысутнасці беларускага мастацкага слова ва Узбекістане. А, між тым, гісторыя сувязей — гэта і гісторыя публікацый многіх іншых аўтараў. У тым ліку і ў перыёдыцы, калектыўных зборніках.

Адным з першых ва Узбекістане чытачу стаў вядомы беларускі пісьменнік Андрэй Александровіч — па творах у калектыўным зборніку ў 1931 годзе. Яркі прыклад увагі да беларускай літаратуры ва Узбекістане — дарога народнага паэта Беларусі Максіма Танка да ўзбекскага чытача. Першыя вершы таленавітага творцы былі надрукаваны ў Ташкенце ў 1951-м — у адным з калектыўных зборнікаў. Перакладчыкі — А. Мухтар, Міртэмір. У 1962 годзе вершы беларускага паэта выходзяць у калектыўным зборніку беларускай паэзіі на ўзбекскай мове. Перакладчык — Маўлон Ікрам. У гэтым жа годзе ва Узбекістане выдаецца і асобны зборнік вершаў і паэм Максіма Танка. І надалей творчасць Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Ленінскай прэміі, старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі з зайздроснай сістэмнасцю прадстаўляецца ўзбекскаму чытачу на яго роднай мове — у 1967, 1972, 1973, 1974, 1978, 1981, 1982, 1983 гадах у газетах і часопісах «Узбекистон маданияти», «Узбекистон адабиёти ва санъати», «Ёш ленинчы», «Тошкент окшоми», «Совет Узбекистони», іншых выданнях. Перакладчыкі — С. Рахман, Ю. Эшбекаў, Т. Убайдуло, Р. Мукімаў, З. Камілаў, Х. Салах… Была і публікацыя пра творчасць Максіма Танка ва ўзбекскай перыёдыцы — артыкул у газеце «Комунна» 17 верасня 1982-га.

Тройчы выступаў ва Узбекістане з апавяданнямі Васіль Хомчанка — у газеце «Ташкент окшомі» 20 верасня 1979 г., у майскім нумары часопіса «Гунча» за 1982 г. і ў калектыўным зборніку ў 1982 г. Народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін таксама быў сярод аўтараў, якіх добра ведаў узбекскі чытач. Многія яго кнігі прыходзілі ў Ташкент на рускай мове, як і многія яго творы. Узбекскі чытач адкрываў іх па публікацыях у «Роман-газете», «Дружбе народов», іншых цэнтральных, усесаюзных літаратурных часопісах. А ў 1966 і 1988 г. ва Узбекістане асобнымі выданнямі выйшлі раманы І. Шамякіна. «Атланты і карыятыды», у прыватнасці, пераклаў Э. Мусаеў. Друкаваліся і асобныя апавяданні І. Шамякіна на ўзбекскай мове. Іх перакладчыкі — Р. Алімаў, Ф. Ганіхаджаеў. З вершам у газеце «Ёш ленинчи» 29 сакавіка 1974 г. выступіў беларускі дзіцячы паэт Станіслаў Шушкевіч. У 1974 г. для калектыўнага зборніка адно з апавяданняў Алеся Якімовіча пераклаў на ўзбекскую мову Э. Мірабідаў. З 1962 да 1979 г. шмат выступала з вершамі ва ўзбекскай перыёдыцы Еўдакія Лось — у газетах і часопісах «Совет Узбекистони», «Узбекистон маданияти», «Гулистон», «Шарк Юлдузи», «Тошкент окшоми». Сярод перакладчыкаў твораў беларускай паэтэсы — і легендарная Зульфія, якая была цесна звязана з Беларуссю праз сяброўства з Якубам Коласам, Эдзі Агняцвет і двойчы, а можа і болей, гасцявала ў Беларусі.

У газетах і часопісах Узбекістана было змешчана і нямала твораў Валянціна Лукшы, адрасаваных дзецям, — у перакладах Р. Таліба, А. Кучымава. А ў 1986 г. выйшла ў Ташкенце і асобная яго кніга ў перакладзе на ўзбекскую мову. 3 снежня 1982 г. у газеце «Узбекистон адабиёти ва санъати» быў надрукаваны пераклад верша Петруся Макаля (перакладзенне на ўзбекскую ажыццявіў К. Рахімбаеў).

2 чэрвеня 1967 года газета «Тошкент хакикати» надрукавала апавяданне Паўла Кавалёва (у перакладзе Г. Джураевай). Між іншым, Павел Кавалёў — актыўны перакладчык узбекскай літаратуры. У 1963 г. выйшаў у Мінску раман Шарафа Рашыдава «Мацней за буру» ў перакладзе Паўла Кавалёва і Аляксея Кулакоўскага. З узбекскай мовы Павел Нічыпаравіч пераклаў і апавяданне «Белыя галубы» Х. Назіра (надрукавана ў сакавіцкім нумары часопіса «Вясёлка» за 1985 г.).

Узбекскіх перакладчыкаў заўжды прыцягвала і творчасць народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова. У 1963 годзе выйшла яго ўзбекская кніга. Сярод перакладчыкаў народнага паэта Беларусі — М. Бабаеў, Г. Гулям, Мірміхсін, Ш. Курбан і іншыя ўзбекскія творцы. Дзве кнігі паэзіі народнага песняра Беларусі Янкі Купалы выдадзены ў Ташкенце ў 1953 і 1983 гадах.

Многія вершы Янкі Купалы з'яўляліся на старонках часопісаў і газет «Шарк Юлдузи», «Совет Узбекистони», «Узбекистон адабиёти ва санъати», «Тошкент окшоми», «Тошкент хакикати». Перакладчыкі — Зульфія, Х. Гулям, М. Бабаеў, Міртэмір…

У Ташкенце выдадзены на ўзбекскай мове і дзве кнігі вершаў Васіля Віткі — у 1966 і 1979 г. Перакладчыкі паэзіі Васіля Віткі — М. Бабаеў, П. Мумін, літаратары, якія і самі шмат пісалі для юнага чытача. Вядомы ўзбекскаму чытачу і Анатоль Вярцінскі — па публікацыі ў газеце «Тошкент хакикати» 8 красавіка 1980 г. (перакладчык — Н. Мухтараў). Друкаваўся з вершамі ва Узбекістане і народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. У дзіцячай газеце «Ленин учкуни» болей як у дзесяці нумарах друкавалася на ўзбекскай мове адна з аповесцей Міхася Герчыка — у 1960 г.

Шкада, што толькі адным вершам адкрыты ўзбекскаму чытачу класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч — публікацыя «Санета» ў газеце «Узбекистон адабиёти ва санъати» 11 снежня 1981 г. Перакладчык — С. Рахман.

У розныя гады ў Ташкенце выдадзены анталагічнага характару калектыўныя зборнікі беларускай паэзіі і прозы, дзе на ўзбекскай мове былі прадстаўлены творы класікаў і сучаснікаў — Андрэя Александровіча, Эдзі Агняцвет, Ніны Тарас, Тараса Хадкевіча, Міколы Хведаровіча, Станіслава Шушкевіча, Кандрата Крапівы, Сцяпана Ліхадзіеўскага, Алега Лойкі, Максіма Лужаніна, Еўдакіі Лось, Міхася Лынькова, Петруся Макаля, Міхася Машары, Івана Навуменкі і іншых вядомых аўтараў.

Вывучаючы беларуска-ўзбекскія літаратурныя сувязі, нельга абысці ўвагай і тыя факты вандровак, творчых сустрэч, якія ладзілі ў Ташкент, Узбекістан беларускія літаратары. Так, лёсы Якуба Коласа, Сцяпана Ліхадзіеўскага, Эдзі Агняцвет, Аркадзя Мардвілкі ў сувязі з Ташкентам — эпізоды вядомыя. А ў Ташкенце і Андзіжане жыў і працаваў у Вялікую Айчынную вайну крытык, тэатразнавец Міхась Модэль. У 1943–1944 гг. ён займаў пасаду дырэктара тэатра імя У. Маякоўскага ў Андзіжане. У адным з тэатраў Ташкента на пачатку 1950-х гг. галоўным рэжысёрам працаваў беларускі драматург Віктар Галаўчынер. Агледзіны па коласаўскіх мясцінах Ташкента праводзіў (і пасля шмат пісаў пра гэта ў беларускай перыёдыцы) публіцыст, літаратуразнаўца, краязнаўца Мікола Жыгоцкі. У фестывалі паэзіі ў Ташкенце прымала ўдзел паэтэса Галіна Каржанеўская.

…Народны паэт Рыгор Барадулін, наведаўшы Узбекістан у сакавіку 1981 г., пакінуў пра сваю паездку цікавыя дзённікавыя запісы. Літаратар згадвае сустрэчы з узбекскімі пісьменнікамі — Ібрагімам Рахімам (1916—2001), Шарафам Рашыдавым (1917—1983; на той час — першы сакратар ЦК Кампартыі Узбекістана), Абдулою Арыпавым (1941—2016) і іншымі. Сапраўдны мастак слова, Рыгор Барадулін вобразна, рэльефна замалёўвае прыроду, ландшафт Ташкента і іншых гарадоў, дзе давялося пабываць. Дзеліцца ўражаннямі ад знаёмства з простымі ўзбекамі: «Аралля і першая трава, сад цвіце, і раптоўна жабы, як перапонкі не лопнуць. Зямля стала ўмомант хатняй.

Канцэрт. Дзеткі цікава на дзвюх мовах — славяне па-ўзбекску, а ўзбек маленькі па-руску. У Андзіжане нарадзіўся Султан Джура (пахаваны ў нас на Гомельшчыне).

Значыць, усё ў парадку, калі ўспыхвае авацыя пры імі Абдулы Арыпава, значыць, эстафета ёсць — на ўзбекскай мове Арыстоцель, Гётэ, Дантэ…»

Старонкі братняй дружбы беларускай і ўзбекскай літаратур працягваюць пісацца і сёння. З'яўляюцца новыя пераклады, здзяйсняюцца сумесныя праекты, сведчаннем чаму — і гэтыя публікацыі на старонках «ЛіМа».

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Фота з сайта advantour.com

Якуб КОЛАС

На захадзе сонца

Схіляецца дзень к надвячорку.
Ў зняменні стаяць тапалі
І слухаюць песню-гаворку
Арыкаў ташкенцкай зямлі.

А колькі іх тут — і не злічыш,
І мера не мерана ім:
Двор кожны і кут маляўнічы
Ім рады, як дзецям сваім.

Скрозь сетку лісцянай адзежы
Паказвае сонца свой твар,
А я пазіраю на межы,
Дзе захаду грае пажар.

У спёртым паветры заслонай
Звісае над горадам пыл,
А захад — празрыста-чырвоны,
Не жывіць ён хмар — няма сіл.

Сухое узбекскае неба
Скупое на дождж і на гром,
І цешыцца марна не трэба,
Што новы дзень прыйдзе з даждж ом.

Што громы душу мне ўзвяселяць
І ўзрадуюць хмары мой зрок:
У чыстай прахладнай купелі
Не ўмыецца заўтра дзянёк.

І я ў засмучэнні і ў болю
Гадаю аб краі сваім,
І шмат бы сказаў, ды даволі:
Мне смутак есць вочы, як дым.

1943 г.

Алесь ЗВОНАК

Ташкент

Спаў мірны горад. Чорны аксаміт
Нябёс, расшытых бісернаю плоймай,
Прыкрыў зямлю, як старадаўні шчыт,
Каб спала сэрца Азіі спакойна.

І раптам — гул.
І ў дробны друз граніт
У момант скрышан сілай неўтаймоўнай.
І лёг стагодні пыл на мармур пліт,
І пацямнеў абрыс красы чароўнай…

Але ўстаяў і перамог хаос
Назло сляпой стыхіі раззлаванай
Краса Усходу — Азіі калос!

Я быў з табой у дзень той акаянны.
І твой, як свой, я ў сэрцы боль пранёс,
Каб зажылі зямлі жывыя раны.

1966 г.

Мікола МЯТЛІЦКІ

Узбекістану

Вітанне шлю табе, Узбекістан,
Краіна самых памятных шчадрот!
Калі мой край таптаў фашысцкі бот
І ўся зямля сціналася ад ран,

Ты прыхінуў
з гасціннасцю сардэчнай
Збалелых суайчыннікаў маіх.
Як памяці той гойнай ускалых,
Дзе спела зерне дружбы
нашай вечнай, —

Радкі, што ускіпаюць палкім гневам,
Тут створаныя Коласам. Яны,
Як кулі, секлі грудзі злой вайны,
Не змыць іх боль усім
зямным залевам.

І сёння ўдумна бронзавы пясняр
Глядзіць штохвілі
на Чымган высокі.
Яму чутны ташкентцаў юных крокі,
І прасвятлеў паэта хмуры твар,

І знік даўно з вачэй слязы туман.
Вярнуўся ён у светлыя гасціны
З далёкае і блізкае краіны…
Вітанне шлю табе, Узбекістан!

2019 г.

Эркін ВАХІДАЎ

«І быць заўжды з табою…»

Беларусь і Узбекістан вельмі блізкія, ментальна роднасныя краіны, што адчуваецца, калі чытаеш паэзію нашых усходніх сяброў. Асабліва ўражвае паэма «Паўстанне бессмяротных» народнага паэта Узбекістана Эркіна Вахідава, якую творца прысвяціў бенгальскаму класіку са шматпакутным лёсам Казі Назруло Ісламу, а таксама вялікі верш Эркіна Вахідава — «Мой узбек», які больш падобны на кароткую паэму. Творчасць народнага паэта Узбекістана павінна быць блізкай і нашаму чытачу сваім высокім патрыятызмам, глыбінёй і народнасцю.

Эркін Вахідаў (1936—2016) — адзін з яркіх прадстаўнікоў сучаснай узбекскай літаратуры, драматург, перакладчык і дзяржаўны дзеяч. Нарадзіўся ў Ферганскай вобласці ў сям'і настаўніка. Вучыўся ў Ташкенцкім дзяржаўным універсітэце, пасля заканчэння працаваў у розных выдавецтвах і рэдакцыях газет і часопісаў. Перакладаў на ўзбекскую мову творы многіх вядомых замежных паэтаў, такіх як Аляксандр Твардоўскі, Іаган Вольфганг фон Гётэ, Мухамад Ікбал, Расул Гамзатаў, Сяргей Ясенін. Прызнаннем заслуг паэта стала прысваенне ў 1999 годзе Эркіну Вахідаву звання «Герой Узбекістана».

Сёння да ўвагі чытача творчасць Эркіна Вахідава ў перакладзе на беларускую мову Навума Гальпяровіча.

Мой узбек

Гісторыя твая скрозь тысячу вякоў
Святлом спрадвечным свеціць, мой узбек.
Равеснік твой Памір, старэйшы ад вышынь,
Сівы Цянь-Шань вячысты, мой узбек.

Афрасіяб сказаў пра гэта нам,
Пісьменнасцю Урхун праклаў твой шлях.
У пацерках вякоў каменьчык лепшы ты,
І цешыш погляд людзям, мой узбек.

Аль-Біруні, Аль-Харэзмі — славуты продак твой,
Пачатак твой Узлук або Тархон,
Вялікі Аль-Фараб і цені мудрацоў —
Над беднай галавой адчуў ты шабляў свіст.

Султаны, каганы і ханы над зямлёй
Пранесліся не раз, і гора, і бяду
З ваеннаю навалай і з попелам сівым
Ты сустракаў таксама, мой узбек.

І горы, нібы ўдавы, сціскаліся вакол,
І дзве ракі , як вочы, слязамі працяклі,
І клаўся іх цяжар на твой пакутны твар,
І слёзы выціраў ты часта, мой узбек.

Ад рымскага цара крывавае таўро,
Батый і Чынгісхан пакінулі сляды.
На целе, на тваім, іх раны бачыў свет,
Але трывалы шчыт быў на грудзях, узбек.

І з чатырох бакоў ляцелі стрэлы зноў,
Жыццё, нібы ахвяра, дзе толькі смерць і пыл,
Радзіма несла стогн, і плач гудзеў вакол
Дачок тваіх, сыноў і жонак, мой узбек.

Ды не схіляў ты голаў, стаяў, нібы скала,
Мукана, патрыёт, хоць галава ў пятлі,
Ды вольнаю крывёй гудзелі жылы зноў,
І вытрымаў ты годна, мой узбек.

Не вогнепаклоннік, не будыст,
Твая святая вера чысцюткая заўжды,
Як светлае сумленне, як раніцы ўзыход,
Як людскасць і гуманнасць, мой узбек.

Ад цемры да святла твой клаўся мудры шлях
Да таямніц навук, да думак трапяткіх,
І зорамі вачэй і дыяментам слёз
Ты ў вечнасць уваходзіў, мой узбек.

Курагані табліцу Мірзо склаў Улукбек,
Што лесвіцай да неба таемнага была,
Сваёю сілай думкі, і мудрасцю сваёй
Зноў у вякі ўваходзіў ты славай, мой узбек.

І Наваі слаў голас паэзіі сваёй,
Нібыта крыкам птушкі над ранішняй зямлёй,
І стаў султанам верша і рыфмы стаў царом,
І край навек уславіў, мой узбек.

Ды ўсёмагутны ў ведах, султан ад вершаў, цар,
Рабом адвечным лёсу свайго зямнога быў.
Ён паспытаў пакутаў, ён плакаў і трываў,
Ён слёз праліў нямала, мой узбек.

Мірзо Бабур крычаў, агнём святым палаў,
І кроў Машраба-шаха лілася на зямлю,
Яна магутнай лавай і велічным агнём
Кіпела ў тваім целе, мой узбек.

Самотная Надзіра, паэзіі сястра,
Як срэбра яе слёзы і цела чысціня,
Сваю хавала мару, нязбытную, на жаль,
Ды пра яе помнім і любім, мой узбек.

Фурхат быў у выгнанні, аседлы — Мукімі,
Афганістан і Індыя пачулі гэты стогн,
І разам з імі чулі іх покліч землякі,
Была ў іх еднасць душаў, мой узбек.

Каб летапіс твой скласці, о слаўны мой народ,
Патрэбны сотні тысяч такіх Фердаусі,
Таму што толькі выдых агучаны адзін,
Баладаў варты тысяч натхнёных, мой узбек.

Гісторыю народа ў мінулым бачым дні,
Прайшлі бяда і гора, застаўся ззаду страх,
Рубцы ад даўніх шрамаў амаль што не смыляць,
Мы ўсе адчулі сілу, мой узбек.

І пасвятлела неба, і сонца узышло,
І ноччу проблеск светлы убачыўся здаля.
І ўсе надзеі светла над краем узышлі,
Над любым нашым краем, мой узбек.

Я назаву Радзіму квітнеючай парой,
Вясновым светлым садам, дзе кветкаю цвіцеш,
Яна мне ёсць вачыма і вей ёсць мае,
І ты адчуеш гэта, мой узбек.

Я ганаруся гэтым, о, родны мой народ,
Падняўшы свае грудзі, трымаеш ты гару,
Як шчодры мой дзехканін,
Радзімы верны сын,
Табою ганаруся, мой узбек.

Мой любы суайчыннік, калі кажу я ў свет,
Чаму б мне не ўславіць усё, што існа тут,
Час выклікае роздум, спазнанне прыйдзе ў дом,
І мудрасць будзе з намі, мой узбек.

Я сын свайго народа, Радзімы верны сын,
Я сын ўсяго сусвету, ды ўсё ж хачу найперш
Удзячным сынам быць тваім, надзейным назаўжды,
І быць заўжды з табою, мой узбек.

Хоць мне вялікі Пушкін нібы ўвесь сусвет,
І Байран свеціць мудра мне з глыбіні вякоў,
Ды у мяне ёсць продак — вялікі Наваі,
І гонар надзвычайны прыходзіць, мой узбек.

І знакам адпаведным заўжды на галаве
Нашу я цюбецейку і гонар бачу свой,
Узбекістан мой родны вядомы на ўвесь свет,
І я іду шчаслівы і горды, мой узбек.

Табе складаю оды, любімы мой народ,
З падзякаю сыноўняй за хлеб твой і за соль,
Прымі маю удзячнасць, любоў маю прымі
Ад вернага Эркіна, мой узбек.

Паўстанне бессмяротных

Урыўкі з паэмы

Мяцежная песня

«Спявай, спявай, пакуль душа палае,
І з зоркамі размоў вядзі працяг.
Хай ветрык на вяршынях Гімалаяў
Табе падорыць вольніцы абсяг.
Стань музыкай ўрачыстай, звонкай, гордай.
Стань песняй гор і паўнаводных рэк,
Спявай, забыўшы пра бяду і гора,
Пра гэты подлы і нястрымна-жорсткі век.
Пакутуе ад крыўды ў гневе сэрца,
Чаму ж не чутны людзям голас твой?
Чаму мы ўсе ў маўклівай паняверцы,
Нібы рабы з схілёнай галавой?
Стварыў багоў ты, ды забылі богі
І пра цябе, і твой жыццёвы шлях.
Кумір за пакаленне плаціць болем,
Ды бура вось абрынецца наўсцяж.
Бліснуўшы ў цемры яркаю маланкай,
Лампады ты, як індра, запалі,
Ты Шыва, над сусветам і над Гангам,
Ты горды волат на сваёй зямлі.
Ні раю спевы, і ні адскай серы
Агонь не пераможа барацьбы,
Ты і Бургі бязлітаснае сэрца,
Ты флейта Крышны. І мы не рабы.
Агонь палае. Бунтаваць ён кліча,
Рабом не заставайся ні на міг.
Агонь палае. І яго аблічча —
Нібыта памяць прадзедаў тваіх.
Няхай памрэш ты, ды памрэш ты вольным,
Да зор ты песняй узнясешся ўвысь.
Той песняй звонкай, радаснай, раздольнай,
Што стане нашым гімнам баявым!»
Наўруз замоўк. Маўчалі і паэты.
Адзін сказаў: «Ці верыш у гэта, брат?
Пра што, скажы, і нам навошта гэта?
Хоць забірай радкі свае назад».
Пасыпаліся ўслед за ім пытанні:
А дзе пра ружы, пошчак салаўёў,
Дзе словы пра пяшчоту і каханне,
Пра водар садоў і крозы сноў?
Няўжо вось гэта — светлы спеў Усходу,
Дзе перы, што чакае нас здаля?
А тут пра нейкі бунт і пра свабоду,
Пра волю і мяцежны нейкі шлях.
Ды ні Хафіз, ні велічны Саадзі
Не пададуць мяцежніку рукі,
І шкадаванне будзе ў іх паглядзе
За гэтыя мяцежныя радкі.
Ён, гэтак тут выводзячы рулады,
Грэх на сваю душу бярэ цяпер,
Ён паўстае насупраць шарыяту,
Народ яго не прыме напавер.
Адзін нагой таптаць пачаў падлогу,
Другі рукой махнуў і ў злосці сціх.
«Ты адступіў ад веры і ад Бога,
І ад сяброў пакрыўджаных сваіх».

Калькута, 1921 год

Гора таму, хто сляпы ад маны,
Крыкам сваім тут імам барабан заглушае.
Свішчуць нажы над Калькутай, яны
Тут нечы лёс і жыццё вырашаюць.
Кроў мусульманіна разам з індуса крывёй
Зліліся ў жудасны вір у гэтым страшным патоку.
Дзеці народаў, што жылі спакон тут вякоў,
Сілы і моц сваю ў гэтай агоніі топяць.
— У бой дзеля Буды, — хрыпіць ў асляпленні індус.
— У бой дзеля помсты, — ўздымае свой меч мусульманін.
Дзеці народаў ў смяротную бойку ідуць,
Маці у роспачы вочы да неба ўздымаюць.
Вера на веру. Рахунак загіблым расце.
Брат тут на брата. Рэлігій сышліся кінжалы.
Слёзы на тварах жанчын і дзяцей.
Плача дзяўчынка між гэтых страшэнных пажараў.
Індыя — маці — прапахла бядой і крывёй,
Індыя — маці — прапахла пакутай і горам,
Ды вінаваты зусім не народ ў гэтым твой,
Хоць за мінулае носіць ён сорам.
Там, на верандзе, дзе ціш і спакой,
Каву служанка нясе свайму беламу босу,
Ён гэтае водзіць імгненне сваёю рукой,
Што яму люд гэты голы і босы.
Тая разня яму трэба цяпер,
Гэтым раздорам цябе ён атруціць, бы ядам,
Каб акіян твайго лёсу, павер,
Ціха люляў яго белую яхту.

Развітанне

Даўно з народам новыя паэты
І боль, і радасць дзеляць напалам.
Ды ўжо адзін саракавое лета
Выгнаннікам жыве Назрул Іслам.
Тут іншы час і новыя імгненні,
Ды ён адзін, не вінаваты зноў,
Не бачыў, як прагналі злобных ценяў
І чужаземцаў ад сваіх краёў.
Глядзіць на гімалайскія вяршыні
І бачыць толькі горнае святло…
Чуць больш за трыццаць на зямлі пражыў ты.
Памёр ты, калі семдзесят прайшло.
Вялікі сын краіны Хіндустана,
Не ўспыхне міг жыцця ў тваіх вачах.
Бывай, паэт! А вершы з намі стануць
І будуць на зямлі тваёй як сцяг.

Простыя рэчы

Усе адказы — унутры цябе

Галіна Зыранава.

Апошнім часам набірае папулярнасць такі метад знаёмства з сабой, як нейраграфіка, заснаваны на інтуітыўным выяўленні геаметрычных архетыпаў. Ён дапамагае змяніць, палепшыць жыццё. Пісьменніца Галіна Зыранава, якая прайшла ўсе прыступкі ўмення знутры ствараць сябе наноў, спасцігаючы метады нейраграфікі, зразумела, што ўжо даўно займаецца гэтым у прозе. Эксперт-практык у сферы самаацалення і самадапамогі, яна падтрымлівае людзей у складаных выпадках, калі жыць, здавалася б, немагчыма, а памерці — нельга. «Тое, што дапамагло мне, дапаможа і іншым», — кажа пісьменніца. Галіна спявае акапэльна народныя песні, скончыла музычную школу па класе баяна, друкавалася ў «ЛіМе», «Маладосці», раённай і абласной перыёдыцы, калектыўных зборніках.

— Галіна, нейраграфіка — кірунак, які з'явіўся адносна нядаўна. Дзе і каму гэта можа спатрэбіцца?

— Па першае, нейраграфіка — для людзей свядомых, якія самі ствараюць сваё жыццё, хто хацеў бы пашырыць магчымасці, хто пра нешта марыць, але не можа адважыцца. Дакладней, думае, што не можа. Бо насамрэч, калі ўзнікла мара, а жаданне вяртаецца ў душу раз за разам, гэта сведчанне, што чалавек можа і здольны! Метад нейраграфікі якраз і дазваляе здымаць падобныя ўнутраныя блокі.

Унутраная матывацыя — гэта наша ўсё. Прычым матывацыя не проста як водгук на незадаволенасць нечым — яна павінна быць знутры, ты апрыёры павінен хацець нешта змяніць, а не таму, што так сказала мама ці твой начальнік… Далей трэба, акрамя жадання нешта змяніць, штосьці рабіць — і не раз альбо два, а ператварыць гэта ў частку твайго жыццёвага досведу. Наступная ступень — рабіць тое многа разоў і рабіць лёгка, не са сцятымі зубамі, у стане адкрытасці, даверу і любові.

— А як ты стала займацца нейраграфікай?

— Сустрэча з нейраграфікай была для мяне спантанная, гэта як нешта ўпала на цябе з неба! Але, асвоіўшы пэўныя рэчы, усё ж думаю, што мы не маглі не сустрэцца. Проза, якую пішу, — нейраграфіка ў слове. Калі толькі пачынала, назвала свой кірунак жывой кнігай. Гэта пра глыбінную размову з сабой, калі ты не «вядзеш» кнігу, але давяраешся ёй, прытым ніколі не ведаеш, куды яна цябе завядзе. Яна сама стварае герояў, вобразы і сімвалы і вядзе цябе ўслед за імі. Яна дапамагае табе прадбачыць, што будзе далей. І, дзіўна, тое, што ты прапісваеш у сваіх кнігах, — праз нейкі час насамрэч становіцца рэальнасцю, хаця і не літаральна.

Для мяне нейраграфіка стала важным этапам. У мяне ўсё жыццё быў блок, што я не ўмею маляваць. Так доўга жыла з гэтай праблемай, пакуль інтуітыўным пісьмом не дайшла да жадання стаць ілюстратарам уласных кніг. А ўслед на мяне і «звалілася» нейраграфіка! Пачала выкарыстоўваць яе як метад, які дазваляе не рабіць абмежаванняў. Пазбавіцца ад таго, што здаўна засела ў галаве. Мне дапамагло, я пабачыла, што кожны раз магу дазваляць сабе ўсё больш і больш, пачала эксперыментаваць і парушаць правілы — і гэта цудоўна! Я ў працэсе!

У нейраграфіцы я адкрыла так званы эстэтычны коўчынг, а калі потым прачытала пра гэта ў іншых, зразумела: мае творы менавіта пра гэта! Калі нельга ўспрымаць кнігі ў адрыве ад формы. Пісала, і было такое адчуванне, што я іграю, як іграюць партытуру на музычным інструменце. Гэта эстэтыка слова, эстэтыка гуку.

— Для вырашэння кожнай канкрэтнай праблемы існуе свой малюнак?

— Хутчэй, нейраграфіка — сукупнасць алгарытмаў, паслядоўнасць дзеянняў. Яны агульныя для ўсіх, хто карыстаецца нейраграфікай. Гэта кантакт з сабой. А калі ты кантактуеш з сабой і здабываеш інфармацыю знутры, то твой малюнак будзе адрознівацца ад любога іншага. Напрыклад, калі хтосьці жадае павысіць свой дабрабыт (публічна выступаць, спяваць, маляваць), на самым пачатку трэба задзейнічаць асноўны алгарытм зняцця абмежаванняў, дзе трэба настроіцца на пэўную праблему і зрабіць унутрана несвядомы выкід энергіі думак, эмоцый, адчуванняў, мітрэнгі, што адбываецца ў галаве, маркерам на паперу. Як выдых… Калі потым пачынаеш гарманізаваць прастору, што ўтварылася, абводзіць, размалёўваць, нечакана з хаосу праяўляецца малюнак. Часта ён падобны на абстракцыю, але ў гэтай абстракцыі абавязкова нешта знойдзецца! А можа нагадваць і рэальную зямную ці касмічную рэч. Далей працуеш з колерам — а гэта інтуітыўная праца: ты дазваляеш сабе маляваць тымі адценнямі, да якіх адчуваеш цягу. Прайшоўшы ўсе алгарытмы, атрымліваеш малюнак. Гэта работа, якая праходзіць без слоў і інструкцый: усе перажыванні пераводзяцца ў вобразы і гарманізуюцца праз прынцыпы малюнка: закругленне, аб'яднанне і пад. Пасля, на больш свядомых этапах работы, важна ўсё: як ты штрыхуеш, з якой інтэнсіўнасцю, якая якасць тваёй штрыхоўкі і якія алоўкі для гэтага абіраеш… Калі працуеш, напрыклад, з алгарытмам «Нейрадрэва», дзе ёсць паглыбленне ў карані і роднасную сямейную сістэму, мінулае, дзе закранаюцца рэсурсы, што ёсць у сучаснасці і ў будучыні, пачынаецца свядомая работа з колерам, яго можна выбіраць, ведаючы сімволіку. Можна ўжываць і пэўныя фігуры.



Нейраграфіка. Базавы алгарытм зняцця абмежаванняў.

Усяго ў сукупнасці каля васьмі алгарытмаў. І, асвоіўшы кожны з іх, можна інтэнсіўна развівацца, унутры сябе знаходзіць рэсурс для вырашэння любой, нават самай складанай, праблемы.

— Калі прыходзіш да псіхатэрапеўта, у першую чаргу ён кажа пра адказы на ўсе пытанні, якія знаходзяцца ўнутры цябе, а ты павінен іх выцягнуць і вырашыць сваю задачу…

— Так, нейраграфіка — гэта маўклівы коўч. Адзінае, чаго ён вымагае, — уседлівасці. Так, апошні свой малюнак я рабіла гадзіны чатыры. Гэта было нейрадрэва на вялікім аркушы… Працэс, які нельга абарваць на палавіне, з мноствам дэталей, якія трэба выпраўляць, — ты пражываеш процьму эмоцый. І гэта звязана з той праблемай, унутраным запытам, з якім пачаў гэта рабіць. Ты выходзіш вычарпаны да дна, але з пэўным досведам.

Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Зімовае шчасце паэтаў

Канал «Культура» Беларускае радыё

У рамках блока раніш-ніх праграм «У рытме дня» на канале «Культура» Беларускага радыё выходзяць праекты «Адным штрыхом» з вершамі беларускіх аўтараў, а таксама «Ранішні серыял», дзе гучыць дэтэктыў Маргарыты Латышкевіч «Уласны крыж».

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе старонкі рамана Івана Мележа «Завеі, снежань». У «Радыёбібліятэцы» слухайце аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха».

Для аматараў паэзіі ў перадачы «Прачулым радком» у суботу і нядзелю прагучаць вершы Зінаіды Дудзюк.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у выхадныя складуць дзве часткі радыёспектакля «Шчасце паэта» па аднайменнай п'есе Васіля Віткі (да 140-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы).

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

У нядзелю і чацвер увазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Развагі пра літаратуру». Радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» гэтага пісьменніка, якая гучыць на «Культуры» ў нядзелю і сераду, прапануе сустрэчу з пісьменніцай, лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Маргарытай Латышкевіч.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

12 снежня — 110 гадоў з дня нараджэння Мікалая Маслава (1912—1992), беларускага харавога дырыжора, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

14 снежня — 115 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Ражбы (1907—1995), беларускага акцёра, заслужанага артыста БССР.

15 снежня — 85 гадоў з дня нараджэння Яўгена Ждана (1937—2016), беларускага мастака тэатра, графіка, жывапісца, заслужанага работніка культуры БССР.

15 снежня — 70 гадоў з дня нараджэння Уладзіслава Рубанава (1952—1994), беларускага празаіка.

16 снежня — 85-годдзе адзначае Алена Юрашкевіч (1937), беларуская майстрыца дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

13 снежня — у публічную бібліятэку № 8 імя М. Багдановіча на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым. Пачатак у 15.00.

13 снежня — у Мінскі гарадскі тэатр паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы на спектакль паводле Лізаветы Палеес «Песні сэрца — назаўжды аддаю». Пачатак у 17.30.

14 снежня — на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Верасок» у дзіцячую бібліятэку № 16. Пачатак у 10.00.

14 снежня — на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міхасём Пазняковым, прысвечаную Году гістарычнай памяці, у гарадскую паліклініку № 8. Пачатак у 14.00.

15 снежня — на творчую сустрэчу з дзіцячым пісьменнікам Міхаілам Дзеравянкам у СШ № 84. Пачатак у 12.15.

15 снежня — на прэзентацыю зборніка паэзіі «Памяць — бяссмерце народа», прысвечанага Году гістарычнай памяці. Імпрэза пройдзе на філалагічным факультэце БДУ. Пачатак у 16.00.

16 снежня — у кніжны магазін «Светач» на прэзентацыю кніг Уладзіміра Мазго, Міхася Пазнякова, Іны Фраловай. Пачатак у 12.00.

16 снежня — на творчую сустрэчу з пісьменнікам Дзмітрыем Мікалаевым у Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Мінскага раёна (г. Заслаўе, м-н 2). Пачатак у 18.00.

Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

9 снежня — у Музей Максіма Багдановіча (Гродна, вул. 1 Мая, 10) на літаратурна-музычную вечарыну «Чытаем Багдановіча разам» да дня нараджэння паэта. Пачатак у 16.00.

13 снежня — у Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей (а. г. Гудзевічы, Мастоўскі раён) на сустрэчу з гродзенскімі пісьменнікамі. Пачатак у 15.00.

14 снежня — у аддзел мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага (Гродна, вул. Савецкая, 25) на юбілейную творчую вечарыну публіцыста-гісторыка, краязнаўца Аляксандра Сявенкі. Пачатак у 16.00.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламедаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 08.12.2022 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 735

Друкарня Рэспубліканская ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 2926
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 22049